Голас Радзімы

№ 24 (1286) ЧЭРВЕНЬ 1973 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 18-ТЫ ЦАНА 2 КАП.

У ваколіцах Вязынкі.

Фота І. МАРОЗА.

ДА БАЦЬКОЎСКАГА ДОМУ

Людзі на чужой старане, як птахі пералётныя. Нібы і добра — сонца грэе, няма сцюжы, а не радуе сытая экзотыка. Як толькі павее веснавы вецер, сэрца зноў просіцца ў палёт. Цягне да роднага гнязда, што прымасцілася на раскідзістых суках старога дуба, да зялёнага прыволля лугоў, расквечаных фарбамі лета, да бярозавага гаю, напоўненага чароўнымі гукамі, у якія ўпляталася і твая песня.

Так і суайчыннікі па-за межамі Бацькаўшчыны. З надыходам вясны ўзрастае і становіцца нясцерпным сум па Радзіме. Хто не меў магчымасці ані разу пакланіцца бацькоўскаму парогу, той у пісьме просіць хоць паспачуваць яму, зразумець яго жыццё, запоўненае адзінотай.

А хто аднойчы зведаў шчасце спаткання з Радзімай, той хоча памножыць яго. Калі чалавек не бачыў родны кут ад таго часу, як пакінуў яго, боль тугі нібы прытупляецца. Яна, як асколак у целе старога салдата: жыць можна, нават часам і забываецца, што ён з табой да канца, але раптам заварушыцца, заные на змену пагоды, і тады выразнымі становяцца карціны перажытага.

Суайчыннік, які аднойчы ступіў на родную зямлю і пасля доўгіх год разлукі ўбачыў яе новую красу, больш востра адчувае адарванасць ад Бацькаўшчыны, пустату існавання эмігранта. Колькі ж гэта раз, падарожнічаючы з землякамі па Беларусі, даводзілася чуць шчырыя, ад сэрца сказаныя словы: «Такая прыгажосць наўкол, такое жыццё! І ты мусіш кінуць гэта ўсё і вяртацца кудысьці на чужыну!..»

Мікалаю і Вользе Дубатаўкам з канадскага горада Віндзара, якія ўжо не раз былі ў Беларусі, зноў хацелася б пажыць у гасцініцы «Юбілейнай», пахадзіць па мінскіх бульварах і парках.

Уладзіміру Гаўрыцкаму з Ванкувера не церпіцца зноў «патаптаць тую зямлю, якую ў маленстве босымі нагамі таптаў». Але гэтую прыемную сустрэчу прыдзецца адкласці яшчэ на год: абставіны не дазваляюць прыехаць сёлета.

Для нашай зямлячкі Лідзіі Андросавай, жыхаркі ФРГ, гэта вясна прынясе доўгачаканае. «Мы з мужам хочам наведаць Маскву, — піша ўсхваляваная жанчына. — Для нас, простых людзей, нялёгка назбіраць на такую паездку, але мы адкладвалі па пфенігу, бо ўбачыць Маскву — самае вялікае жаданне. Мы хочам дазволіць сабе такую радасць».

Дзеля такой радасці — убачыць Бацькаўшчыну — тысячы землякоў ужо збіраюцца ў далёкую дарогу. Калі спытаць кожнага з іх, куды ён едзе, большасць, напэўна, адкажа так, як Адам Раманоўскі з Англіі:

— Дадому!

— Але ж твой дом у Лондане, — запярэчылі яму былыя аднавяскоўцы. — Хутка сорак год міне, як ты выехаў з Рудні.

— І ўсё ж я прыехаў дадому! —сказаў Адам. — Мой дом тут, дзе я нарадзіўся, дзе жыве мой народ. Бо дом — гэта не толькі сцены і столь над галавой, гэта нешта большае... У мяне такое пачуццё, што ў Англіі я нібы часова, трапіў па нейкаму непаразуменню. Гэтага пачуцця, відаць, я не пазбаўлюся ніколі... Хаця там у мяне сям'я, дзеці. Англія — іх радзіма...

Напэўна і сёлета, як і кожны турысцкі сезон, сустракаючыся з замежнымі беларусамі, давядзецца пачуць ужо даўно знаёмыя словы: «Мы — не чужаземцы, мы — свае!»

Турысцкае лета пачалося. Першыя ластаўкі прыляцелі яшчэ ў маі. Прыехалі паасобныя суайчыннікі з-за мяжы наведаць свае родныя мясціны. Цяпер рыхтуюцца ў падарожжа землякі з Канады і Злучаных Штатаў Амерыкі, краін, дзе асела вялікая колькасць

(Заканчэнне на 4-й стар.)

«ЛУНАХОД-2» ВЫКАНАЎ ПРАГРАМУ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НА МЕСЯЦЫ

Праграма навукова-тэхнічных даследаванняў і эксперыментаў, праводзімых з дапамогай аўтаматычнага самаходнага апарата «Лунаход-2» на паверхні Месяца, выканана поўнасцю.

За чатыры месяцы з «Лунаходам-2» было праведзена 60 сеансаў радыёсувязі, у ходзе якіх выконваліся аперацыі па кантролю за работай бартавых сістэм, кіраванню рухам, навуковыя эксперыменты і перадавалася інфармацыя на Зямлю.

За пяць месяцавых дзён, рухаючыся ва ўмовах складанага рэльефу, аўтаматычны апарат пераадолеў 37 кіламетраў. Павышаная манеўранасць і мабільнасць «Лунахода-2» далі магчымасць пераадолець адлегласць у 3,5 раза большую, чым шлях, пройдзены першым самаходным апаратам «Лунаход-1».

З дапамогай тэлевізійнай апаратуры, устаноўленай на борце самаходнай лабараторыі, былі перададзены на Зямлю 86 панарам і звыш 80 тысяч тэлевізійных здымкаў месяцавай паверхні. У ходзе здымання атрыманы стэрэаскапічныя адлюстраванні найбольш цікавых асаблівасцей рэльефу, якія даюць магчымасць правесці дэталёвае вывучэнне іх будовы.

Па трасе руху лунахода рэгулярна вымяраліся фізіка-механічныя ўласцівасці паверхневага пласта месяцавага грунту і неаднаразова праводзіўся аналіз хімічнага саставу месяцавых парод. Праведзеныя даследаванні далі магчымасць атрымаць разнастайную інфармацыю аб розных утварэннях на паверхні Месяца: кратэрах, камяністых россыпах і асобных каменнях, схілах тэктанічнага разлому.

Упершыню з паверхні Месяца выконваліся вымярэнні свяцімасці месяцавага неба, праводзіліся эксперыменты па лазернай пеленгацыі лунахода.

На працягу ўсяго перыяду работы бартавыя сістэмы і канструкцыі лунахода вытрымлівалі значныя дынамічныя нагрузкі і добра пераносілі рэзкія тэмпературныя ваганні. У прыборным кантэйнеры пастаянна падтрымліваліся зададзеныя параметры мікраатмасферы: тэмпература — ад плюс 12 да плюс 32 градусаў па Цэльсію, ціск — ад 770 да 830 міліметраў ртутнага слупка.

Атрыманая з дапамогай савецкай лабараторыі навуковая інфармацыя паслужыць далейшаму расшырэнню ведаў аб Месяцы і навакольнай касмічнай прасторы.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●



На поўную магутнасць працуюць вытворчасці па выпуску поліэтылену, нітрыл акрылавай кіслаты, сінтэтычнага валакна нітрон на Наваполацкім хімічным камбінаце імя 50-годдзя БССР.

ГОРАД НОВАБУДОЎЛЯЎ

За апошнія два гады значна расшырыліся межы Наваполацка. З'явіліся новыя вуліцы. Гараджане атрымалі больш за 2 400 добраўпарадкаваных кватэр. У строй дзеючых уведзены фабрыка хімчысткі, гандлёвы цэнтр, адкрыліся новыя атэлье, магазіны, сярэдняя школа, прафілакторый - санаторый хімкамбіната.

Вялікі аб'ём будаўнічых работ запланаваны і на бліжэйшыя гады. Пачата будаўніцтва новага вучэбна-лабараторнага корпуса Наваполацкага філіяла тэхналагічнага інстытута. Узводзяцца паліклініка, міжгародняя тэлефонная станцыя.

Далейшае развіццё атрымлівае прамысловасць.

ХУТКА ПУСК

Новы камбікормавы завод, разлічаны на выпуск 500 тон прадукцыі ў суткі, будуецца ў Глыбокім. Асноўныя тэхналагічныя працэсы тут будуць поўнасцю механізаваны і аўтаматызаваны.

Цяпер на будаўнічай пляцоўцы ўжо заканчваецца мантаж асноўнага абсталявання.

АЎТААМАТАРАМ МІНСКА

У Мінску, па суседству з Чэрвенскім рынкам з'явілася новая будаўнічая пляцоўка. Тут узводзіцца гараж, які адрозніваецца ад звычайных. Гэта сапраўдная «гасцініца» для «Волг», «Масквічоў», «Запарожцаў», «Жыгулёў», якія знаходзяцца ў асабістым карыстанні мінчан. На параўнаўча невялікай тэрыторыі ў ім змогуць размясціцца адначасова 630 аўтамашын.

Новы гараж не зусім звычайны і па сваёй планіроўцы. Ён размесціцца на чатырох паверхах. На кожны з іх спраектаван асобны ўезд. Частка першага паверха адводзіцца пад лінію штодзённага абслугоўвання машын, дзе будуць працаваць механічныя мыйка, устаноўка для сушкі аўтамабіляў пасля мыцця. Акрамя таго, абсталёўваюцца два пасты тэхнічнага абслугоўвання. Аўтааматары змогуць атрымаць напракат неабходныя інструменты.

ПРАЗ ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ

На пытанне, якім будзе Пінск у 2000-ым годзе, адказвае выстаўка, якая адкрыта ў мясцовай карціннай галерэі. Тут на шматлікіх стэндах размешчаны макеты будучага горада, што зроблены супрацоўнікамі Мінскага цэнтральнага навукова-даследчага інстытута па горадабудаўніцтву.

Па генеральнаму плану забудовы горада вуліцы райцэнтра ўпрыгожаць дзевяці- і дванаццаціпавярховыя дамы, вырастуць новыя спартыўныя комплексы, кінатэатры, школы. Старажытны Пінск стане адным з прыгажэйшых гарадоў на Палессі.

Уборка жыта на зялёны корм у саўгасе «Беларусь» Жабінкаўскага раёна.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ
агляд навін

Таварышамі па зброі сталі ў гады Вялікай Айчыннай вайны беларусы і палякі. Салдаты Войска Польскага змагаліся з гітлераўцамі на тэрыторыі Беларусі, у радах Савецкай Арміі беларусы вызвалялі польскую зямлю ад фашысцкай пошасці. У сувязі з 30-й гадавінай з дня нараджэння Войска Польскага групе савецкіх грамадзян, што жывуць у нашай рэспубліцы, уручаны высокія ўзнагароды ПНР. На ўрачыстую цырымонію ў Мінск прыбыў ваенны, ваенна-марскі і ваенна-паветраны аташэ пры пасольстве ПНР у СССР генерал дывізіі Чэслаў Чубрыт-Баркоўскі, які і ўручыў польскія ўзнагароды ветэранам.

Гасцямі беларускай сталіцы на мінулым тыдні былі група аўстрыйскіх камуністаў на чале з членам Цэнтральнага Камітэта КПА Ота Тромлем, дэлегацыя Таварыства бельгійска-савецкай дружбы і група французскіх медыцынскіх работнікаў. Госці агледзелі выдатныя мясціны Мінска. Намеснік мэра бельгійскага горада Ля Лувіер Жыльбер Вандэвордэ выказаў жаданне наведаць Салігорск, дзе пазнаёміўся з работай гарадскога Савета дэпутатаў працоўных, гаспадарчым і культурным будаўніцтвам у маладым беларускім горадзе. Французскіх медыкаў зацікавіла рэспубліканская клінічная бальніца ў пасёлку Лясным Мінскага раёна, яны таксама наведалі дзіцячы хірургічны цэнтр, Мінскую гарадскую станцыю «Хуткай медыцынскай дапамогі».

У Маскве завяршыў сваю работу XV кангрэс Міжнароднага інстытута тэатра ЮНЕСКО. Прадстаўнікі сцэнічнага мастацтва з усіх кантынентаў абмеркавалі на ім праблемы сувязі тэатра з гледачом. Ад Беларускай ССР у рабоце кангрэса прынялі ўдзел народная артыстка СССР Л. Александроўская, народныя артысты рэспублікі Ф. Шмакаў (Віцебскі тэатр імя Я. Коласа), Г. Волкаў (Брэсцкі тэатр імя ЛКСМБ), І. Папоў (Гомельскі абласны тэатр), доктар мастацтвазнаўства У. Няфёд і іншыя.

З Мінска на турнір юных футбалістаў у французскі горад Гэнэн выехала юнацкая зборная БССР. У гэтым папулярным турніры будуць удзельнічаць 12 каманд: юнацкія зборныя ФРГ, Італіі, Венгрыі, Польшчы, Галандыі, 5 французскіх каманд і юныя футбалісты нашай рэспублікі, якія пяты раз атрымалі запрашэнне на турнір. Чатыры гады запар яны займалі на ім першае месца.

ПЕРСПЕКТИВЫ СОВЕТСКОГО АВТОСЕРВИСА

ЗАМЕСТИТЕЛЬ НАЧАЛЬНИКА ГЛАВАВТОТЕХОБСЛУЖИВАНИЯ МИНИСТЕРСТВА АВТОМОБИЛЬНОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ СССР БОРИС МОЛЧАНОВ РАССКАЗЫВАЕТ КОРРЕСПОНДЕНТУ АГЕНТСТВА ПЕЧАТИ НОВОСТИ Н. СЕМИНОЙ О РАЗВИТИИ АВТОМОБИЛЬНОГО СЕРВИСА В СТРАНЕ.

Парк личных автомобилей в СССР, насчитывающий сегодня свыше двух миллионов, быстро растет. В 1973 году в торговую сеть поступит еще 526 тысяч машин.

Вот почему на ближайшие годы и намечена широкая программа развития автосервиса, которая будет осуществляться в двух направлениях. Главное из них — строительство широкой сети станций технического обслуживания. На станциях предусмотрены салоны для продажи автомобилей и запасных частей.

Второе направление — оснащение существующих и строящихся станций самым современным гаражным и диагностическим оборудованием. Сейчас впервые в градостроительной практике разрабатываются комплексные проекты целых автомагистралей, вдоль которых располагаются мотели, кемпинги, заправочные станции, а также станции технического обслуживания. В мотелях, равномерно размещаемых вдоль дорог, пока машина проходит осмотр или ремонтируется, пассажиры и водители смогут поесть, отдохнуть от утомительной дороги.

Такие учреждения автосервиса уже есть на автомагистралях под Смоленском, возле Ленинграда, на Московской кольцевой дороге. Опыт лучших из них станет основой развития автосервиса в стране.

Уже получил признание автолюбителей московский центр технического обслуживания на Варшавском шоссе. Здесь можно сделать множество дел: капитально отремонтировать машину или просто проверить «самочувствие» своего автомобиля. За десять минут человек в форменной одежде «прокрутит» вашу машину на диагностическом стенде и скажет о ней все. Техническое обслуживание автомобилей хорошо поставлено в Киеве.

Когда автолюбитель покупает машину марки «Жигули», то вместе с паспортом на нее ему вручают сервисную книжку, которая предписывает в установленные сроки проводить техническое обслуживание. Казалось бы, в этом нет ничего особенного. Однако здесь можно увидеть приметы нового отношения завода к своей продукции.

Молодой Волжский автозавод, озабоченный тем, как и где будут эксплуатироваться «Жигули», какие качества проявит автомобиль, применил новую для страны организацию технического обслуживания. Завод принял на себя всю заботу об автомобиле, начиная со дня его выпуска.

На территории СССР действует немало мелких станций технического обслуживания, построенных по старым типовым проектам, от которых сейчас пришлось отказаться. Они уже не обеспечивают выполнения всех видов работ по обслуживанию и ремонту, стали нерентабельными и не отвечают потребностям автосервиса. У новых моделей автомобилей трудоемкость обслуживания снижается, но растет конструктивная сложность, требующая особого, квалифицированного подхода к ремонту.

Волжский завод ввел в практику гарантийный заводской сервис, организовав серию собственных станций в крупных городах. И эта мера оправдана тем, что была выявлена полная картина всех недостатков нового автомобиля, что позволило провести ряд мер для их устранения.

С точки зрения специалиста, сервисные станции «Жигулей» ценны прежде всего тем, что они постоянно информируют завод о поведении автомобиля в эксплуатации. Станции располагают новейшим ремонтным и диагностическим оборудованием, специальным инструментом, оснасткой и приспособлениями, комплектами запасных частей. Здесь не только быстро и квалифицированно исправят поломку автомобиля, но и проконсультируют его владельца.

АПН.

ГАРЫЗОНТЫ навукі

АДКРЫЦЦІ, ПОШУКІ, МЕРКАВАННІ

АДРАЗУ ЧАТЫРЫ распрацоўкі Інстытута цепла- і масаабмену Акадэміі навук Беларускай ССР прызнаны выкананымі на ўзроўні вынаходстваў.

Група супрацоўнікаў інстытута знайшла спосаб тэрмаапрацоўкі бетонных вырабаў у электрамагнітным полі току прамысловай частаты пры залішнім ціску асяроддзя. Новая тэхналогія значна скарачае час цвярдзення і структураўтварэння, павялічвае трываласць бетонных вырабаў.

Дзве распрацоўкі інстытута адносяцца да ўдасканалення прадукцыі фармацэўтычнай прамысловасці. Яшчэ адна знаходка, выкананая на ўзроўні вынаходства, — спосаб разагрэву змерзлых сыпкіх матэрыялаў шляхам электранагрэву іх заглыбленымі лакальнымі крыніцамі цяпла.

ФІЛІЯЛ УСЕСАЮЗНАГА навукова-даследчага інстытута праблем арганізацыі і кіравання Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы вырашана адкрыць у Мінску.

На філіял гэтага інстытута, які будзе працаваць у цеснай садружнасці з многімі навукова-даследчымі ўстановамі Беларусі, усклaдзены задачы, звязаныя з распрацоўкай актуальных праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу.

ПРАБЛЕМАМ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ сельскагаспадарчай вытворчасці прысвечана навукова-вытворчая канферэнцыя, якая адбылася ў Мінску. Яна склікана Заходнім аддзяленнем Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна. У канферэнцыі ўдзельнічалі вучоныя, спецыялісты і арганізатары сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі.

На канферэнцыі былі заслуханы даклады аб перспектывах развіцця сельскай гаспадаркі рэспублік Прыбалтыкі і БССР, аб канцэнтрацыі вядучых галін сельскай гаспадаркі, аб некаторых эканамічных аспектах індустрыялізацыі вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі і паляводства. Канферэнцыя, на думку спецыялістаў, будзе спрыяць далейшаму развіццю навукова-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны краіны.

АКАДЭМІК КРАСІН: «БУДУЧЫНЯ ЗА АЭС»

На пытанні нашага карэспандэнта адказвае дырэктар Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР акадэмік АН БССР, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, лаўрэат Ленінскай прэміі Андрэй КРАСІН.

— Інстытут ядзернай энергетыкі, які вы ўзначальваеце, адзін з самых маладых навуковых цэнтраў рэспублікі. Які ўклад у навукова-тэхнічны прагрэс унёс яго калектыў за гады свайго існавання?

— Інстытут ядзернай энергетыкі як самастойная ўстанова існуе з 1965 года. Галоўная яго задача — выяўленне новых навуковых даных з мэтай выкарыстання атамнай энергіі і перш за ўсё ўдасканальванне вытворчасці электраэнергіі за кошт ядзерных пераўтварэнняў. Галоўны напрамак інстытута — пошук новых цепланосьбітаў, якія далі б магчымасць пабудаваць атамныя электрастанцыі вялікай магутнасці. Другі напрамак работы інстытута звязаны з выкарыстаннем радыяцыі для патрэб хімічнай вытворчасці.

Трэці раздзел работ звязаны з выкарыстаннем гамапраменняў. Наш інстытут мае магутную гама-ўстаноўку дасканалай канструкцыі, якая дае магчымасць абпраменьваць значныя аб'ёмы матэрыялаў, напрыклад, медыцынскія інструменты, выкананыя на аснове пластыкаў. Іх нельга моцна награваць. Таму звычайным спосабам (у гарачай вадзе і сушыльных шафах з высокай тэмпературай) іх стэрылізаваць нельга. Аднак гэта можна рабіць з дапамогай гама-праменяў.

— Раскажыце, калі ласка, аб перспектывах развіцця ядзернай энергетыкі ў Беларусі.

— Энергетыка Беларусі развіваецца шпаркімі тэмпамі. За гады бягучай пяцігодкі яе энергамагутнасць узрасце ў 1,8 раза. Гэта значна вышэй за сярэднія тэмпы развіцця галіны ў цэлым па краіне. У нас будуецца гігант электраэнергіі — Лукомская ДРЭС магутнасцю 2 мільёны 400 тысяч кілават. Відаць, гэта лічба будзе даведзена да 4 мільёнаў кілават. Але недалёкі час, калі патрэбы народнай гаспадаркі ў электраэнергіі перавысяць усе наяўныя энергамагчымасці. Баланс паліва Беларусі недастатковы, каб на ўласных сыравінных рэсурсах будаваць вялікую энергетыку. Таму вельмі актуальным з'яўляецца будаўніцтва атамных электрастанцый. У ацэнцы перспектыў развіцця электраэнергіі да 1990 года значная роля адведзена ядзернай энергетыцы. У недалёкай будучыні плануецца пабудаваць у рэспубліцы ўласную АЭС.

— Ці аказвае адмоўны ўплыў работа атамных электрастанцый на навакольнае асяроддзе?

— Вопыт работы АЭС у нас у краіне і за мяжой паказвае, што яны зусім бяспечныя. Нават, наадварот, звычайныя цеплавыя станцыі, спальваючы вугаль, нафту, мазут, газ, даюць адходы шкодных сярністых газаў. Вопыт паказаў, што надзейная канструкцыя сістэмы дазваляе эксплуатаваць АЭС, не дапускаючы адходаў радыёактыўных рэчываў у навакольнае асяроддзе. Словам, у спецыялістаў усталявалася трывалая думка, што пры развіцці буйной энергетыкі найбольш бяспечнай з'яўляецца менавіта сістэма АЭС.

У канцы XX стагоддзя, магчыма, гэты від электрастанцый будзе самым папулярным.

— Як вы ацэньваеце моладзь, якая прыходзіць да вас пасля сканчэння вышэйшых навучальных устаноў?

— У нашым інстытуце моладзі належыць значная роля. Большая частка супрацоўнікаў атрымала адукацыю ў Беларусі. Сярод нашых маладых калег ёсць многа здольных вучоных, якія паспяхова вырашаюць складаныя тэхнічныя задачы. Мы падтрымліваем трывалыя дзелавыя кантакты з вучэбнымі інстытутамі, чытаем лекцыі ў студэнцкіх аўдыторыях, даём магчымасць студэнтам праходзіць у нас практыку, перадаём ім свае веды і вопыт. За кароткі тэрмін мы дабіліся актыўнага ўдзелу моладзі ў навуковых даследаваннях інстытута.

— Неўзабаве споўніцца 20 гадоў з дня пуску першай у свеце Обнінскай атамнай электрастанцыі. Ад вас, аднаго са стваральнікаў гэтай станцыі, хочацца пачуць ацэнку гэтаму збудаванню з пазіцыі сённяшняга дня. Ці апраўдвае АЭС тыя надзеі, якія ўскладалі на яе ў перыяд пуску?

— Першая атамная электрастанцыя даказала ўсяму свету, што атамная энергія можа быць выкарыстана ў мірных мэтах. Мне давялося сустракацца з рознымі людзьмі ў розных краінах — прадстаўнікамі ўрадавых колаў, вучонымі, простымі рабочымі. Усе яны шчыра захапляліся нашым дасягненнем. Першая АЭС дала станоўчыя вынікі па трох галоўных патрабаваннях: устойлівасць і надзейнасць у рабоце, бяспека для абслугоўваючага персаналу і навакольнага асяроддзя, эканамічнасць. Обнінская АЭС стала добрай школай для савецкіх і зарубежных спецыялістаў, што працуюць у галіне ядзернай энергетыкі.

Зразумела, цяпер у нас у гэтай справе больш ведаў і вопыту, чым дваццаць гадоў назад, але павінен сказаць, што ўсе галоўныя пытанні тады былі намі вырашаны правільна. За 20 год ні адзін цеплавылучаючы элемент не выйшаў са строю, не аказаўся ў аварыйнай сітуацыі.

Пасля III Жэнеўскай канферэнцыі ў 1964 годзе ва ўсім свеце склалася перакананне, што атамныя электрастанцыі могуць быць выкарыстаны шырокім фронтам. Мяркуецца, што да 2000 года магутнасць такіх станцый узрасце да некалькіх мільярдаў кілават. Такая грандыёзная перспектыва ядзернай энергетыкі ў немалой ступені з'яўляецца вынікам поспеху першай у свеце Обнінскай АЭС.

М. АМЕЛЬЧАНКА.

НА ЗДЫМКУ: акадэмік А. КРАСІН.

ПАЛІМЕРЫЗАЦЫЯ ВА ЎДАРНЫХ ХВАЛЯХ

Вывучаючы ўздзеянне ўдарных хваль на арганічныя рэчывы, савецкія вучоныя адкрылі невядомую раней з'яву — палімерызацыю ва ўдарных хвалях. Гэта значыць, што простыя малекулы імгненна злучаюцца ў складаныя палімерныя ланцугі, якія налічваюць дзесяткі тысяч звенняў.

Пры сціскванні цвёрдых цел і вадкасцей ударнымі хвалямі на мільённыя долі секунды развіваюцца ціскі парадку дзесяткаў і соцень атмасфер, скачком змяняюцца шчыльнасць і тэмпература рэчыва. Даўно было вядома, што ў такіх умовах складаныя малекулы ператвараюцца ў больш простыя. Цяпер савецкія вучоныя адкрылі зваротнае ператварэнне — зусім нечаканае з пункту гледжання старых уяўленняў.

Дэталёвыя даследаванні паказалі, што, уздзейнічаючы ўдарнымі хвалямі рознай інтэнсіўнасці на адны і тыя ж малекулы, можна атрымаць палімеры рознай будовы і ўласцівасці. Выяўлена, што пры ўдарным сціскванні наглядаецца палімерызацыя практычна ўсіх няпэўных арганічных злучэнняў, у тым ліку такіх, якія практычна не палімерызуюцца ў звычайных умовах.

Працягваючы свае даследаванні, вучоныя даказалі магчымасць ударна - хвалевага сшывання палімерных ланцугоў. Так, сыры каўчук пры праходжанні па ім ударнай хвалі імгненна ператвараецца ў гуму.

Новая з'ява мае цікавасць для розных галін навукі. Падобныя рэакцыі могуць, напрыклад, адбывацца ў нетрах зямлі пры распаўсюджванні ўдарных хваль, выкліканых тэктанічнай дзейнасцю. Ударныя хвалі ўжо цяпер знаходзяць шырокае выкарыстанне ў тэхналагічных працэсах.

Адкрытая савецкімі вучонымі новая з'ява істотна расшырае кола практычнага выкарыстання ўдарных хваль. Гэтае адкрыццё зрабілі спецыялісты Інстытута хімічнай фізікі АН СССР.



Лабараторыя электроннай мікраскапіі кафедры глебазнаўства Беларускай сельгасакадэміі ў Горках. Тут вывучаюць найбольш рацыянальную сістэму выкарыстання ўгнаенняў.

СТУДЭНТЫ-КАНСТРУКТАРЫ

Па просьбе карэспандэнта Агенцтва друку Навіны Яўгена БУДЗІНАСА старшыня Савета студэнцкага навуковага таварыства Мінскага радыётэхнічнага інстытута Мікалай ДАНІЛОВІЧ расказвае аб рабоце студэнцкага канструктарскага бюро (СКБ) пры гэтым буйнейшым інстытуце Беларусі.

Задача нашага інстытута зусім не ў тым, каб падрыхтаваць інжынера для выпуску канкрэтнай прадукцыі. Задача шырэйшая і больш высакародная — навучыць маладога чалавека інжынерна мысліць. Трэба з першых дзён вучобы ўцягнуць студэнта ў творчасць, далучыць яго да свету пошукаў і ідэй.

У нашым СКБ, якому ўжо споўнілася пяць гадоў, усё як у сапраўдным бюро — ёсць канструктарскі аддзел, шэсць лабараторый пры асноўных кафедрах інстытута, аддзел нармалей і стандартаў. Уся работа сканцэнтравана ў руках студэнтаў, пачынаючы з арганізацыйных пытанняў і складання планаў і канчаючы вырашэннем чыста творчых задач.

Пры СКБ створан студэнцкі эксперыментальны вылічальны цэнтр. На трох ЭВМ «Прамень» працуюць звыш трыццаці студэнтаў спецыяльнасці «Вылічальная тэхніка», якія выконваюць заказы СКБ, расшыраюць, удасканальваюць свае практычныя навыкі на эксплуатацыі інжынерных ЭВМ.

Фінансавай асновай СКБ з'яўляюцца кантракты, якія заключаюцца з прамысловымі прадпрыемствамі і навуковымі ўстановамі. Бюро працуе па заказах і за іх кошт. Прыборы, сканструяваныя нашымі студэнтамі, выкарыстоўваюцца на розных прадпрыемствах і ў навукова-даследчых установах рэспублікі. У год СКБ інстытута выконвае заказы на суму каля 130 тысяч рублёў. Частка гэтых сродкаў ідзе на расшырэнне базы СКБ, другая — на аплату працы студэнтаў.

Заказы прамысловасці ў інстытуце выконвае не толькі СКБ, але і кафедры. Аднак попыт часта перавышае магчымасці кафедраў, і яны тады звяртаюцца за дапамогай да студэнтаў. СКБ неадкладна пачынае выкананне найбольш актуальных заказаў.

Спасцігаючы ў СКБ азы творчасці і арганізацыі, студэнты генерыруюць безліч ідэй. Адна з іх — стварэнне на буйнейшых прадпрыемствах горада студэнцкіх канструктарскіх груп. Іх у радыётэхнічным інстытуце ўжо тры. У кожнай у сярэднім па 20 чалавек. У вольны ад заняткаў час студэнты працуюць непасрэдна ў канструктарскіх бюро і аддзелах прадпрыемстваў, падрабязна знаёмячыся з патрэбамі сучаснай вытворчасці. Тэмы іх распрацовак часта становяцца асновай курсавых і дыпломных праектаў.



Даніла САСЕЎ

МЯСЦІНАМ РОДНЫМ

Навечна сэрцу блізкі самы —
У любую кінь далечыню —
Той кут, дзе дарагое «мама»
Прамовіў я упершыню;

Дзе першым променем
усмешкі,
Як сонцам, маці азарыў,
Дзе першую пракладваў
сцежку
У лузе росным, у бары.

Сляды маіх там босых ног...
І любы мне мясціны тыя;
Па сёння ў памяці збярог
Малюнкі, сэрцу дарагія.

І мне
Навечна
блізкі самы —
У любую кінь далечыню —
Той кут,
дзе дарагое
«мама»
Прамовіў я
упершыню!

ДА БАЦЬКОЎСКАГА ДОМУ

[Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.]

беларусаў. Суайчыннікі з амерыканскага кантынента едуць пераважна ў турысцкіх групах, якія арганізуюць прагрэсіўныя газеты «Русский голос» і «Вестник». Але шмат людзей прыязджаюць прыватна, па запрашэнню родных. Яны будуць гасціць у вёсках і гарадах па месяцу, тры, а то і болей.

Госці ў Беларусь едуць з усіх канцоў свету — з Канады, ЗША, Бразіліі, Аргенціны, Аўстраліі, з краін Еўропы. Мэта падарожжа многіх — мая вёска, мой родны кут. Сюды, абганяючы самыя быстраходныя паветраныя лайнеры, імчыць іх думка. І гэтыя землякі будуць шчаслівымі. І, магчыма, потым падзеляцца з намі сваёй радасцю, як Васіль Яраўчук, які пару гадоў назад прыязджаў у родныя мясціны з Аргенціны: «Мы з жонкай шчаслівыя, што хаця перад смерцю ўбачылі сваю зямлю, сваіх родных і знаёмых, з якімі разам гадаваліся».

Але сустрэча з блізкімі, адведзіны свайго краю не прынеслі б таго вялікага пачуцця, якое землякі называюць шчасцем, калі б яны ўбачылі даўнейшую сярмяжную ды лапцюжную Беларусь. «Мы прыкмецілі, — піша Васіль Яраўчук, — што нашы сваякі і суседзі жывуць не так, як мы жылі за панскім часам».

Нашы суайчыннікі прыязджаюць дадому не толькі дзеля таго, каб «патаптаць» тую сцежку, па якой хадзілі басанож, і не толькі, каб пахадзіць па мінскіх парках. Хаця ў задуме кожнага і гэта займае немалое месца. Галоўная ж мэта падарожжа ў родны край — пераканацца самому, што цяпер сапраўды жывуць не так, як за панскім ці царскім часам. Адчуць новы рытм жыцця на Радзіме, ацаніць тыя сацыяльныя пераўтварэнні, якія прынеслі ў Беларусь Вялікі Кастрычнік і ўлада Саветаў.

Але за раз усяго не ахопіш ні позіркам, ні розумам, не зразумееш і не ацэніш. Таму не выпадкова, што нашы суайчыннікі, калі ёсць магчымасць, прыязджаюць зноў і зноў, праз два гады, праз пяць, праз дзесяць год. І кожны раз не месцяцца ўражанні, кожны раз новыя для сябе адкрыцці.

Першароднае жаданне суайчынніка — наведаць сваю вёску, на якой для яго свет клінам сыйшоўся. Ён не хоча бачыць па-за гэтым светам нічога больш. Але прабыўшы тыдзень-другі, ён пачынае ўсведамляць, што адной вёскі мала, каб уявіць, што такое Савецкая краіна. Нават па расказах людзей ён адчувае, што наўкол так многа цікавага, што грэх было б хоць крышачку не ўбачыць шырокі свет самому. У вёсцы сапраўды жывуць пановаму, у гэтым зямляк сам пераканаўся. І яму ўжо хацелася б убачыць яшчэ нешта — як жывуць людзі ў гарадах, як працуюць. Ці праўда, што ў Савецкім Саюзе самы дзяшовы транспарт і нізкая плата за жыллё! Пераканацца, што ў савецкіх гарадах можна спакойна хадзіць увечары і ўначы. Што ў маскоўскім метро не ездзіць у кожным вагоне міліцыянер, як паліцэйскія ў Нью-Йорку. Пытанняў становіцца ўсё больш і больш, цікаўнасць да нашага спосабу жыцця ўзрастае.

Не дзіва, што Лідзія Андросава, якая двойчы ўжо пабывала на роднай Магілёўшчыне, спачатку з дачкой, а потым з мужам, цяпер хоча паглядзець сталіцу нашай Радзімы Маскву.

У апошнія гады замежныя беларусы едуць на Бацькаўшчыну, маючы ў кішэні дзве візы — адну прыватную, да сваякоў, у госці на ўсё лета, другую турысцкую, якая дае магчымасць аб'ехаць многія гарады Савецкага Саюза, пазнаёміцца з культурнымі здабыткамі савецкага народа, паглядзець, што робіцца ў гэтай агромністай краіне сёння.

Убачыўшы нашы будні і святы на ўласныя вочы, суайчыннік ужо не дасць веры лухце, якой яго намагаюцца карміць з лыжкі буржуазнай ідэалогіі. І не толькі сам не паверыць, іншым дапаможа разабрацца, дзе праўда, а дзе мана. А гэта толькі на карысць і нашаму народу, і народам тых краін, дзе жывуць суайчыннікі-беларусы. Бо яшчэ не перавяліся аматары поўзаць па нашых задворках, глядзець на наша жыццё праз шчыліну ў плоце і шукаць учарашні дзень.

«На мінулым тыдні, — піша Яўген Мяжохаў са Злучаных Штатаў Амерыкі, — у нашым горадзе паказвалі карціну «Расія». Паверце, гэта была самая нізкая і подлая прапаганда! Паказаны былі самыя непрывабныя задворкі ў Ленінградзе, Ташкенце, Новасібірску і Маскве. Рэкламуюць, што фільм здымаўся сакрэтна. Няма, каб паказаць маскоўскае метро, Крэмль, новыя гасцініцы і будаўніцтва. І ўсё выдаецца за чыстую манету! Як шкада, што да гэтага часу простых амерыканцаў усё яшчэ кормяць такой нізкай хлуснёй. Мне хацелася ўстаць і крыкнуць на ўвесь кінатэатр: «Не верце гэтай мярзотнай прапагандзе!»

Значыць, прынамсі, адзін чалавек не паверыў буржуазнай прапагандзе. Не паверыў, бо Яўген Мяжохаў быў на Радзіме і сам бачыў, якое тут жыццё. Вось чаму імкненне суайчыннікаў убачыць бацькоўскі дом выходзіць за межы асабістай справы і набывае шырокае патрыятычнае і грамадзянскае гучанне. Бо няма вышэйшага гонару, як бараніць добрае імя Радзімы ад паклёпнікаў і садзейнічаць распаўсюджванню праўды аб ёй ва ўсім свеце.

Леанід Прокша

Хаўроння хоча быць прыгожай

Фельетон

ЖЫЛА некалі ў вёсцы Козікі лянівая і да таго ж брыдкая дзеўка Хаўроння. Яна вельмі зайздросціла прыгожым, працавітым дзяўчатам. А каб неяк зраўняцца з імі і звярнуць на сябе ўвагу, пры нагодзе і без нагоды выхвалялася:

— Мая маці была вельмі прыгожая, а я да яе падобная...

Старэйшыя людзі ведалі, з якога кодла вывелася Хаўроння, і толькі ўсміхаліся.

Так і не ўдалося Хаўронні дапяць таго, каб яе прызналі прыгажуняй. Затое ў гады цяжкай няволі Хаўроння адпомсціла аднавяскоўцам за знявагу і... спадабалася гітлераўцам.

Пасля вайны козікаўская Хаўроння апынулася ў Чыкага... Пры дапамозе найноўшых касметычных сродкаў перафарбавала свой брыдкі твар і, спасылаючыся ўжо не толькі на сваю матулю, а на ўсю матуху Беларусь (маўляў, я не абы якая Хаўроння), дамагалася да сябе ўвагі і павагі. Але і тут людзі абсякалі яе хлусню:

— Брэшаш, дзеўка!..

Высунула Хаўроння свой нацыяналістычна размаляваны твар і сёлета ў сакавіцкія дні, калі ў гарадах Злучаных Штатаў Амерыкі выступалі савецкія гімнасткі. Асабліва ёй зайздросна было чуць і бачыць, з якім захапленнем амерыканцы прымалі выступленне семнаццацігадовай Вольгі Корбут. І ёй закарцела прымазацца да заслужанай славы цудоўнай дзяўчыны, выкруціць «собскае» бебурнацкае сальта.

Намалявала Хаўроння плакацік, нашкрабла грошай на букецік кветак і пабегла да гарадскіх улад, каб, як потым заявіла карэспандэнту радыёстанцыі «Свабода», «паставіць на ногі гарадскую ўправу»...

— Я ад беларускага нацыянальнага камітэта...

— ??

— Дачулася я: у Чыкага прылятае Вольга Корбут...

Твар чыноўнікаў адразу ажывіўся:

— О, гэта цудоўная гімнастка, сальта назад!

— Яна беларуска, і я таксама беларуска... Толькі жыву ў вольным свеце.

— Ну і што?

— Мы (Хаўроная перайшла на множны лік), беларусы на экзылі, просім дазволу сустракаць гімнастак на лётнішчы. Вось плакат напісалі: «Вітаем нашых зямлячак Вольгу Корбут, Тамару Лазаковіч і Антаніну Кошаль!» Наша мэта паказаць свету, паказаць беларускім гімнасткам, што мы жывём, дзейнічаем, змагаемся за іх свабоду...

— Можна пазайздросціць такім «нявольнікам», — усміхнуўся чыноўнік, але, каб адчапіцца ад настырнай наведвальніцы, сказаў:

— О'кэй!

Хаўроння падхапіла свае манаткі і пагнала ў аэрапорт. Яна прабівалася скрозь усхваляваны сустрэчай з савецкімі гімнасткамі натоўп, торкалася ва ўсе бакі са сваім плакацікам, назойліва паўтарала: «Я ж такая, як і Вольга Корбут, — беларуска», але яе адпіхнулі і здратавалі той плакацік. Каму там да Хаўронні, калі перад вачыма сапраўдная прыгажосць...

— На гэтым і скончылася ваша сустрэча? — спытаў Хаўронню карэспандэнт радыёстанцыі «Свабода»?

— На гэтым і скончылася, — адказала Хаўроння, выціраючы насоўкай фарбу, якая распаўзлася па брыдкім твары. — Нас да іх не дапусцілі...

А Хаўронні так хацелася пакрасавацца на фоне слаўных зямлячак, маўляў, я не абы якая Хаўроння...

Не сядзелася ў тыя дні ў Нью-Йорку і Хаўронні ў штатах — Юрку Віцьбічу. Накрымзоліўшы бязглузды артыкульчык «Трагедия Ольги Корбут» і падпісаўшы яго псеўданімам Стукаліч (няёмка ж бебурнацу пісаць паруску), ён пабег у рэдакцыю сіянісцка - белагвардзейскай газеты «Новое русское слово». Як ні пяўся былы гітлераўскі паслугач давесці ў сваім пасквілі «трагічнае» становішча беларускай дзяўчыны, але гэтым толькі яшчэ раз выставіў сябе як халуя іншых хлебадаўцаў.

Цяўкнула з-пад таронцкай падваротні і сівая, аблыселая Хаўроння — Сіняк-Хмара. Яму таксама захацелася на хвалі зайздроснай славы зямлячкі звярнуць на сябе ўвагу. Змясціўшы ў сваім малапісьменным «Беларускім голасе» здымак Вольгі Корбут побач з прэзідэнтам Нікасанам, ён узяўся «растлумачыць свету, кім па нацыянальнасці з'яўляецца Вольга Корбут», і даў зразумець, што Хмара—яе зямляк, беларус.

Але пра тое, што хаўронні накшталт Віцьбіча і Сіняка-Хмары ў гады гітлераўскай акупацыі дапамагалі захопнікам няволіць беларускі народ, і не пікнуў. Не «ўзяўся растлумачыць свету» і той праўды, што толькі дзякуючы братэрскай дапамозе вялікага рускага народа, пакаленне Вольгі Корбут атрымала магчымасць развіваць свае здольнасці і заслужыла прызнанне. Яму выгадней прымазацца да чужой славы.

Хаўроння хоча быць прыгожай, але яе нацыяналістычнае «сальта назад» выклікае толькі агіду...

ДАВЕДНІК БГКТ

У Польскай Народнай Рэспубліцы дзейнічае грамадска-асветная арганізацыя — Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), якое знаходзіцца ў Беластоку. Што сабой уяўляе гэтая арганізацыя, якія дасягненні ў яе дзейнасці, які аўтарытэт мае яна сярод беларускага насельніцтва?

На гэтыя і на шмат іншых пытанняў адказвае кніжка «Беларускае грамадска-культурнае таварыства», якую ў канцы 1972 года выдала на польскай мове Галоўнае праўленне таварыства.

Ва ўмовах народнай улады ў раёнах, дзе пражываюць беларусы, ажыццявіліся вялікія гаспадарчыя, сацыяльныя і культурныя пераўтварэнні. Беларусы народні з палякамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей маюць сёння магчымасць усебакова развіваць сваю культуру.

Гэтая масавая арганізацыя мае свае аддзелы ў паветах Беластоцкага ваяводства, у гарадах Беластоку, Варшаве, Гданьску, праводзіць культурна-асветную работу, падтрымлівае літаратурны рух і выдае кніжкі на беларускай мове, аб чым, у прыватнасці, піша ў сваім артыкуле, змешчаным у даведніку, Аляксандр Баршчэўскі. Галоўны рэдактар «Нівы» Георгій Валкавыцкі расказвае пра беларускі тыднёвік, які ўжо выходзіць без перапынку 17 гадоў.

Даведнік БГКТ дае шматбаковы матэрыял пра беларусаў, што пражываюць у Польшчы, пра іх сяброўскія адносіны з народамі Савецкага Саюза, пра іх актыўны ўдзел у жыцці сваёй краіны — Польскай Народнай Рэспублікі.

В. РУДЧЫК.

ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ ВЫРАТОЎВАЕ РЭКІ

ПРАБЛЕМА ачысткі прамысловых сцёкаў стала сёння адной з важнейшых. Мільёны тон забруджвальнікаў, якія трапляюць у вадаёмы разам са сцёкавымі водамі, нясуць вялікую пагрозу ўсяму жывому. Віды забруджванняў настолькі разнастайныя, што спосабы надзейнай ачысткі ўдаецца знайсці далёка не заўсёды. Сутнасць самага распаўсюджанага рэагентнага метаду ачысткі сцёкавых вод заключаецца ў тым, што ў сцёк дабаўляюць рэчывы-рэагенты, якія выводзяць у нерастваральны асадак забруджвальнікі, якія ўтрымліваюцца ў вадзе. Асадак — шлам—аддзяляецца затым у фільтрах або ў адстойніках.

Цэх рэагентнай ачысткі сцёкаў быў у свой час пабудаваны і на Мінскім заводзе халадзільнікаў. Але цяпер завод перайшоў на новы метад ачысткі—электракаагуляцыйны.

Ідэя выкарыстання для ачысткі сцёкавых вод з'явы электролізу не новая. Аднак удалых тэхнічных вырашэнняў яе да нядаўняга часу не было. Не было, натуральна, і працуючых установак. Першую ўдалую канструкцыю стварылі ў 1960 годзе беларускія вучоныя Міхаіл Мезель і Уладзілен Калер. Прызначалася яна для ачысткі цынкаўтрымліваючых сцёкаў на заводах штучнага валакна. Устаноўка паказала высокую эфектыўнасць і была, акрамя Савецкага Саюза, запатэнтавана ў Англіі, Францыі і Італіі.

Як паказалі далейшыя даследаванні, электракаагуляцыйны метад ачысткі вады можа быць шырока ўкаранёны ў народнай гаспадарцы.

З поспехам дзейнічае цяпер новая ўстаноўка і на заводзе халадзільнікаў. Яна займае ў цэху пляцоўку ўсяго ў 30 квадратных метраў.

У дзве вертыкальныя ванны — каагулятары, падобныя на газавыя калонкі, паступае амаль чыстая на выгляд вада, а выходзіць мутная жыжка. Але чысціні вады на ўваходзе нельга верыць. Раствораныя ў ёй рэчывы без спецыяльнага аналізу не выяўляюцца. А пад дзеяннем току нябачнае стала бачным. Гаворачы больш дакладна, адбылася каагуляцыя—малекулы раствораных рэчываў зліпліся ў камякі. Цяпер аддзяліць гэтыя камякі ад вады на фільтрах або ў адстойніках нескладана.

Якая ж якасць ачысткі? У апошнюю ступень адстойнікаў пусцілі карпаў і карасёў. Адчуваюць яны сябе тут цудоўна.

Загадчык лабараторыі Уладзімір Цярушкін сцвярджае, што сёння можна пачаць серыйную вытворчасць каагулятараў і для гальванічных цэхаў.

— Ачыстка гальванічных сцёкаў распрацавана лабараторыяй дастаткова грунтоўна, — гаворыць ён. — Гальванічных цэхаў многа, яны ёсць на ўсіх машынабудаўнічых заводах. Збудаванні для рэагентнай ачысткі вады дарагія. Нашы ж устаноўкі ў дзесяткі разоў дзешавейшыя.

Эфект аказаўся відавочным і на другім мінскім прадпрыемстве — падшыпнікавым заводзе, дзе сцёкі па характары зусім іншыя, не гальванічныя. Іх асноўны забруджвальнік — нафтапрадукты.

Дырэктар інстытута «Белкамунпраект» Мікалай Пятроў, якому падпарадкавана лабараторыя, сцвярджае, што праблема ачысткі гальванічных і ўтрымліваючых нафту сцёкаў цяпер вырашана поўнасцю. Пры паўсямесным укараненні электракаагуляцыі гэтыя забруджвальнікі нашым вадаёмам пагражаць больш не будуць.

На пытанне аб магчымасцях больш шырокага прымянення новага метаду Уладзілен Калер адказвае:

— Метад, вядома, не універсальны. Але ўжо цяпер мы можам, напрыклад, прапанаваць гатовыя распрацоўкі ўсім аўтагаспадаркам. У іх сцёк па колькасці невялікі, але забруджаны нафтапрадуктамі вельмі моцна. Ды і гаспадарак гэтых многа. Адстойнікі (якія, дарэчы, ёсць яшчэ не ўсюды) і неэфектыўныя, і дарагія. Каагулятары ж каштуюць вельмі танна. Ачышчаная вада будзе прыгодная для паўторнага выкарыстання.

Праверены метад таксама і на водах, забруджаных мыйнымі сродкамі. Прычым вельмі паспяхова. Сучасныя мыйныя сродкі лічацца цяпер найбольш небяспечнымі забруджвальнікамі. Разлагаюцца яны вельмі марудна, а ў рацэ пеняцца не горш, чым у пральні, ствараючы часам шматметровыя слаі пены. Ачыстцы традыцыйнымі метадамі яны не паддаюцца, так што электракаагуляцыя — адзіны выхад.

Добрыя вынікі атрыманы таксама на сцёках гарбарных заводаў, фабрык першаснай апрацоўкі воўны, цэлюлозна-кардонных прадпрыемстваў. А пошук жа яшчэ толькі пачаўся.

... Маленькая лабараторыя працягвае паспяховую барацьбу з забруджваннем вадаёмаў.

І. РАТНЕР.

ВА ЎЗНАГАРОДУ—БАЛГАРСКІ ОРДЭН

Брацкая Балгарыя адзначыла Дзень Кірылы і Мяфодзія — стваральнікаў славянскай пісьменнасці.

Напярэдадні свята ўрад НРБ у ліку групы савецкіх дзеячаў літаратуры і мастацтва ўзнагародзіў ордэнам Кірылы і Мяфодзія народнага паэта БССР, лаўрэата Ленінскай прэміі, акадэміка АН БССР, Героя Сацыялістычнай Працы Петруся Броўку. Сваёй паэтычнай працай, дзейнасцю на пасадзе галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, навуковымі пошукамі ён унёс значны ўклад у развіццё беларускай літаратуры і мовазнаўства—састаўной часткі культуры ўсіх славянскіх народаў.

Сярод савецкіх літаратараў, удастоеных разам з Петрусём Броўкам балгарскага ордэна,— Міхаіл Шолахаў, Канстанцін Федзін, Мікола Бажан, Расул Гамзатаў, Алесь Ганчар, Валянцін Катаеў, Сяргей Міхалкоў, Мірзо Турсун-задэ...

Пятрусь Броўка—трэці кавалер ордэна Кірылы і Мяфодзія ў Беларусі. Раней гэтай высокай узнагароды былі ўдастоены вядомы беларускі паэт і перакладчык з балгарскай і іншых моў Ніл Гілевіч і народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, кампазітар Рыгор Шырма.

пішуць землякі

БУКЕТЫ ИЗ ДОЛЛАРОВ

Умер Марк Вейнбаум. Всю свою сознательную жизнь он безуспешно боролся с коммунизмом и почил в бозе, так и не дождавшись победы. Он был одним из самых злобных ненавистников советского народа и социализма. Был он также и главарем белой русской эмиграции, вокруг которой на антисоветской платформе собрались все отщепенцы и предатели Родины. Как сионист Вейнбаум верой и правдой служил Израилю и выполнял любые задания сионистских организаций.

Смерть этого реакционера вызвала у его единомышленников великую печаль. Любопытно, что почти никто из скончавшихся в Америке выходцев из России не удостоился столь густого фимиама. А ведь это были люди, любящие Россию. Смерть же Вейнбаума вот уже несколько месяцев усердно оплакивается раеакционной прессой потому, что он имел одно единственное «достоинство» —презирал все советское и русское, несколько десятков лет клеветал на Советский Союз в своей газете «Новое русское слово».

Самое, однако, удивительное в том, что сионисты даже смерть Вейнбаума обратили себе на пользу. Его преемник, такой же сионистский ставленник А. Седых ведет сбор пожертвований в память Вейнбаума. Газета «Новое русское слово» пишет, например, что «в память М. Е. Вейнбаума и вместо цветов на его могилу продолжают поступать пожертвования от друзей и почитателей покойного». 50 долларов прислал протоиерей В. Анциферов, по 5—10—15 долларов — П. Медведев, М. Грей, В. Свида, С. Зиверт, Н. Славный, Е. Димер и другие.

В долларовых «букетах» не нуждается ни семья покойного, ни редакция «НРС». Эти деньги Андрей Седых преподнесет сионистской организации «Юнайтед джуиш аппил», она направит их в Израиль, а там ими оплатят бомбы и снаряды, которыми сионисты убивают ливанских граждан и палестинских партизан. Вот вам и доллары вместо цветов — они в конечном итоге обернутся преступлениями и кровью.

Е. МАТЮШКОВ.

США.

Што? * Як? * Чаму?

Наш чытач са Злучаных Штатаў Амерыкі М. Яканюк звярнуўся ў рэдакцыю з просьбай расказаць, як ажыццяўляецца ў Беларускай ССР набор рабочай сілы на буйныя прадпрыемствы і будоўлі і якая наогул у рэспубліцы сістэма працаўладкавання.

ЗАМЕСТ БІРЖЫ ПРАЦЫ

У БССР, як і паўсюды ў краіне, існуюць дзве формы ўладкавання на работу: з дапамогай спецыяльных дзяржаўных і грамадскіх органаў і без гэтай дапамогі, калі грамадзяне звяртаюцца непасрэдна на прадпрыемствы, якія маюць права прымаць неабходную ім колькасць рабочых.

Адзін з галоўных вытокаў, з якога папаўняюцца працоўныя рэсурсы рэспублікі,— моладзь. Звыш 50 тысяч кваліфікаваных рабочых штогод рыхтуюцца ў сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Выпускнікоў вучылішчаў чакае гарантаванае месца работы. Аб гэтым загадзя клапоціцца Дзяржплан БССР, куды паступаюць заяўкі на маладых рабочых з усіх прадпрыемстваў і ведамстваў.

Некалькі адрозніваецца ад гэтай сістэмы працаўладкаванне былых школьнікаў, якія ідуць на прадпрыемствы пасля васьмі або дзесяці класаў. Часцей за ўсё гэта юнакі і дзяўчаты, чый узрост не дасягнуў паўналецця (18 гадоў), таму іх правы на атрыманне работы агавораны асобна. Месца свае́й будучай работы падлеткі выбіраюць з дапамогай камісій па працаўладкаванню моладзі пры мясцовых выканкомах. У састаў камісій уваходзяць адказныя работнікі прадпрыемстваў, куды прымаюць падлеткаў на работу, прадстаўнікі адміністрацыйных органаў і грамадскасці, медыкі. Трэба падкрэсліць, што на кожным прадпрыемстве, згодна са спецыяльнай пастановай урада, штогод абавязкова браніруецца пэўная колькасць рабочых месц для выпускнікоў школ.

З дапамогай сістэмы так званага планавага арганізаванага набору ідзе звычайна масавы прыём рабочых на буйныя новабудоўлі і новыя прадпрыемствы. Усю дзейнасць па каардынацыі планаў перараздмеркавання працоўных рэсурсаў і кіраўніцтва ім ажыццяўляе Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па выкарыстанню працоўных рэсурсаў.

Ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі ў аблвыканкомах ёсць аддзелы гэтага камітэта, а ў буйных раённых гарадах — спецыяльныя ўпаўнаважаныя, да якіх і звяртаюцца жадаючыя аформіцца на якую-небудзь буйную будоўлю Беларусі ці любога іншага кутка краіны, незалежна ад таго, маюць яны прафесію ці не. Тут жа будучы рабочы падпісвае двухбаковы працоўны дагавор. Дакумент гэты гарантуе яму бясплатны праезд да месца работы, выплату пад'ёмных грошай, добрыя ўмовы працы. Са свайго боку рабочы дае адміністрацыі згоду добрасумленна адпрацаваць на новым аб'екце пэўны тэрмін.

Характэрнай толькі для сацыялістычнага ладу з'яўляецца такая форма працаўладкавання, як грамадскія прызывы. З часоў першых пяцігодак, з будаўніцтва Магніткі і Днепрагэса бярэ пачатак гэта слаўная традыцыя. І сёння побач з назвай многіх буйных аб'ектаў пяцігодкі стаяць словы: «Ударная камсамольская будоўля». Яны азначаюць, што ўзводзіць прадпрыемства моладзь, якая добраахвотна прыбыла па камсамольскіх пуцёўках.

Нярэдка здараецца так, што чалавек па тых або іншых прычынах перапыняе сваю працоўную дзейнасць і праз некаторы час вымушаны шукаць новае месца работы. Дапамогу ў гэтым яму аказваюць створаныя нядаўна бюро па працаўладкаванні і інфармацыі насельніцтва аб патрэбнасці прадпрыемстваў у рабочай сіле. Менавіта сюды звяртаюцца дэмабілізаваныя воіны, людзі, якія па сямейных абставінах памянялі месца пражывання, і іншыя. Бюро, куды сцякаюцца ўсе даныя аб наяўнасці свабодных месц і вакансій на прадпрыемствах горада, аператыўна дапамагаюць сваім кліентам выбраць зручнае для іх месца і рэкамендуюць адміністрацыі будучага рабочага.

Усе звенні сістэмы працаўладкавання ў нашай краіне маюць дакладны планавы характар. Гарантыяй пастаяннай занятасці насельніцтва, побач з сацыяльнымі і юрыдычнымі фактарамі, з'яўляецца стабільны характар развіцця савецкай эканомікі. Попыт на рабочую сілу ў нас заўсёды апярэджвае прапанову яе. Любыя без выключэння формы ўладкавання на работу строга захоўваюць шырокія правы кожнага працоўнага, што прадастаўлены яму заканадаўствам. Інтарэсы асобы і дзяржавы тут супадаюць: хуткае працаўладкаванне, з адкаго боку, скарачае непрадукцыйныя страты рабочай сілы, а з другога — пазбаўляе савецкіх грамадзян ад страху стаць беспрацоўнымі, дае ім магчымасць выбіраць справу па густу і здольнасцях.

Мінск. Вуліца Талбухіна.

Фота Э. ТРЫГУБОВІЧА.

Канстанцыя БУЙЛО

МАСКВА ПРЫТУЛІЛА, ЯК МАЦІ...

СТАРЭЙШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭТЭСА КАНСТАНЦЫЯ БУЙЛО, ЯКАЯ ЖЫВЕ І ПРАЦУЕ Ў МАСКВЕ, ПА ПРОСЬБЕ РЭДАКЦЫІ ДАСЛАЛА Ў «ГОЛАС РАДЗІМЫ» СВАЕ ЎСПАМІНЫ.

Часта ў мяне пытаюцца, чаму я жыву ў Маскве, а не на Беларусі. Аб гэтым трэба расказаць падрабязна, інакш не будзе зразумела.

Перад першай сусветнай вайной я працавала ў Полацку, у беларускай кнігарні. Але выбухнула вайна 1914 года, і доля закінула мяне ў канцылярыю Усерасійскага земскага саюза. Амаль да канца вайны праездзіла з той канцылярыяй па Заходнім фронце. Там я пазнаёмілася і па шчырай прыхільнасці выйшла замуж за Віталія Калечыца, студэнта Пятроўска-Разумоўскай сельскагаспадарчай акадэміі. Мы жылі спачатку ў Валакаламскім павеце. Муж мой быў участковым аграномам на станцыі Шабаўская, а потым загадчыкам саўгаса Данілкава, ля паўстанка Матроніна.

Тады да нас, першы раз у жыцці ўзяўшы водпуск, прыехаў з Беларусі мой бацька Антон Аляксандравіч. Трагічна склаўся гэты водпуск. Ён у дарозе захварэў на крупознае запаленне лёгкіх і праз тыдзень памёр. Пахавалі яго ў Матроніна, на могілках гэтага сяла, паставіўшы агарожу з бярозавых бярвенняў, з такіх жа бярвенняў зрабілі высокі крыж. Так першым з нашай сям'і «трапіў» у Маскоўскую вобласць мой бацька.

У 1923 годзе мы з мужам і з маленькім сынам Жэням пераехалі ў Маскву: мужа прызначылі на першую сельскагаспадарчую выстаўку аграномам на паляводчыя пасевы. Маці засталася адна на Беларусі. Сястра мая Інна Антонаўна выйшла замуж за Сілівестра Лысава, які працаваў ляснічым пад Масквой на станцыі Галіцына, і мела ўжо дваіх дзетак. Вярнуўся з фронту брат Віця, які добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію (у адным акне ваенкамата 14-гадовага не прынялі, а ў другім сказаў, што яму 16. Узялі. Быў ён хлопцам рослым і дужым). А прыйшоў з вайны — не было за што зачапіць рукі. Тады мы з сястрой забралі да сябе: я брата, а сястра маму. Так уся сям'я па волі абставін апынулася ў Маскве і Падмаскоўі.

Тут мы перажылі цяжкія часы голаду, холаду, разрухі і дачакаліся лепшай долі. Дзеці нашы выраслі, пакончалі вышэйшыя навучальныя ўстановы, тут засталіся працаваць. Разраслася вялікая сям'я, з якой я арганічна звязана і душой, і пачуццямі, і той сардэчнай дружбай, якая моцна сцэментавала нас на ўсё жыццё.

Але ніколі ні на хвіліну не забывала я родны край, наш беларускі народ, мудры, лагодны, добры да сяброў і страшны да ворага. Вось і цяпер стаяць у вачах людзі з нейкімі прасветленымі дабратой тварамі. Мужчыны — працавітыя, гаспадарлівыя, што спагадліва і лагодна вітаюць чалавека пры сустрэчы. Жанчыны — ласкавыя, добразычлівыя, гасцінныя, мяккія душой. Увайдзі ў трамвай ці аўтобус, спытайся, як трэба праехаць, так зычліва адгукнуцца ўсе і такія ласкавыя вочы асвецяць, што адразу адчуеш сябе ў роднай сям'і.

Я не магу забыць шуму бору, у якім чуліся і напевы родных песень, і сум вялікага гора народа, і яго грозны гнеў, і светлая радасць яго мар і надзей. Мой першы надрукаваны верш быў прысвечаны лесу. Было гэта ў 1909 годзе. Кароценькі, вельмі просты вершык:

Ой ты, лес зялёны,

Чаго ты шуміш,

Ці жыць табе трудна,

Чаму не маўчыш?

Ці якое гора

Ўсё цябе гняціць,

Ці якая пошасць

Над табой вісіць?

Ой, то і не пошасць,

Не цяжар то дум,

Бура мне наводзіць

Гэты страшны шум.

Страшыць мяне бура,

Што ідзе здалёк

І вярхі сасонак

Сцеле ўпапярок.

Брат параіў паслаць верш у «Нашу ніву». Але я сказала, што пасылаць баюся. Эдзік падахвоціўся зрабіць гэта сам і падпісаў верш: «Э. Буйло». І якое ж было наша здзіўленне, калі рэдакцыя прыслала «Нашу ніву» з надрукаваным вершам.

Шмат потым бачыла я лясоў і палёў. Але вастрыня юначага ўспрыймання пакінула ў памяці свае, беларускія ў непараўнальнай красе. І неба ў Беларусі зусім іншае. Дзе яно такое мяккае, ласкавае і добрае? Дзе вы бачылі такія празрыстыя, ружовыя зоры? Ні ў Маскве, ні ў Крыме, ні на Байкале, ні на Балтыцы — нідзе я не сустракала той зачараванасці, якая ўласціва цудоўнай прыродзе Беларусі. І сягоння я лёгка прыгадваю гаркаваты пах вольхі над рэчкай Іслачу, бачу маланкавыя рухі ўюноў у празрыстай вадзе, на жоўтым дне ракі. Помню, у Барсуковіне я ўваходзіла ў лес, як у таямнічы, невядомы свет, поўны цудоўных знаходак і адкрыццяў. Ішла праз поле— і спеў жаўранка дзесьці высока ў небе так гарманічна спалучаўся з хараством зялёных палёў, кустоў у пушыстых жоўтых пупышках, што ўсё гэта злівалася ў суцэльную сімфонію, зачароўваючы вочы і слых.

А побач з гэтым хараством людское гора. Цёмныя, зморшчаныя твары, запалыя вусны, цяжкія ад знясільваючай працы рукі. Беднасць, цемра. Здзіўлялі мяне старыя дзяды, якія сядзелі на прызбах, грэючы на сонцы кашчавыя плечы. У самую душу заглядалі іх вочы, у якіх свяціліся дзіцячая чысціня, глыбокая мудрасць і нейкая сарамлівасць за свой цяжкі і беспрасветны лёс. Усміхаліся яны так, быццам адчувалі сваю віну за тое, што ўсім нам так цяжка жывецца. Гэта першыя ўражанні свядомага дзяцінства, якое ўжо ставіла пытанні, але не ўмела адшукаць адказу на іх.

Потым былі сустрэчы з людзьмі, якія пакінулі глыбокі след у маім жыцці. Захапленне вершамі Купалы, Коласа, Багдановіча, Бядулі. Знаёмства з Уладкай Станкевічанкай, будучай жонкай Купалы. З гэтай сям'ёй звязала мяне моцная і шчырая дружба з юнацкіх дзён і да апошніх хвілін іх жыцця. Мяне зачараваў талент Купалы, які спалучаў тонкі, чулы лірызм з грамадзянскім пафасам. Памятаю, як мароз драў скуру, калі пачула першы раз верш «А хто там ідзе?». І цяпер мурашкі прабягаюць па спіне, калі ўспамінаю той час.

Успамінаю сустрэчу са старым Уласам, які лічыўся рэдактарам «Нашай нівы», хоць болей, як іншыя, гаспадарылі там браты Луцэвічы — Іван і Антон. Памятаю Ядвігіна Ш., аўтара апавяданняў, якія краналі мяне сваёй шчырасцю. Захаплялася я і цудоўнай лірыкай Бядулі, поўнай прачулага суму і нейкай асаблівай напеўнасці. Любіла чаканна звонкі верш Багдановіча, гартаваны, як сталь, і мяккі ў пачуццях, як мелодыі Чайкоўскага.

Усё гэта ўплывала на маю творчасць. Мелі на яе ўплыў і Шаўчэнка, і Міцкевіч, і Пушкін, і Лермантаў, і Славацкі, і Колас. А Талстой, Горкі, Дастаеўскі, Паустоўскі, Твардоўскі, Куляшоў? Ды ці можна пералічыць усіх, чые розум, талент, душа адбіліся ў памяці назаўсёды? Вучылася ў Вільні на настаўніцкіх курсах. Потым працавала настаўніцай у вёсцы. І ўвесь час пісала вершы, якія тады шырока друкаваліся ў часопісах маладой беларускай літаратуры.

Я вельмі шмат атрымлівала ў той час лістоў ад маіх чытачоў. Памятаю, былі лісты з Амерыкі ад нейкага беларуса, які апісваў, як жыве і працуе ў Нью-Йорку рабочы чалавек. Як кожную раніцу прыходзяць да варот завода беспрацоўныя, потым выходзіць да іх гайдук і адбірае тых, хто маладзейшы і дужэйшы. Усе іншыя сумна разыходзяцца. І назаўтра — тая ж сітуацыя.

***

У 1945 годзе памерла мая маці Настасся Францаўна. Не дачакалася, бедная, звароту з вайны сына Віці, але мы ўжо атрымалі вестку, што ён жывы і хутка прыедзе да нас. Пахавалі маму на могілках вёскі Троіца каля станцыі Катуар Савёлаўскай чыгункі.

Мінула амаль 30 год з дня пахавання, а блакітная агарожа на яе магілцы заўсёды свежа пафарбавана, чырвоная зорка на помніку зіхаціць пурпурам. У агарожы вырасла цудоўная пушыстая бярозка, у нагах — ніцая вярба. З прыгорка могілак далёка відаць палі, лугі, лясы, і здаецца, што мама чуе, як мы ўсёй сям'ёй прыходзім да яе.

Сын мой, Андрэй Калечыц, інжынер, працуе ў навукова-даследчым інстытуце начальнікам аддзела. Жанаты. Жыве ў добрай кватэры.

Мой першы муж загінуў. У 1948 годзе я выйшла замуж ізноў, за Барыса Мацвеевіча Ермакова. Ён авіяцыйны інжынер-канструктар. Мы з ім і цяпер жывём на Ціхвінскім завулку ў Маскве. У гэтай трохпакаёвай кватэры прайшло многа год майго жыцця. Тут напісана шмат вершаў, перажыты часіны гора і сапраўднага чалавечага шчасця. Дом гэты, яго сцены для мяне не толькі месца, дзе я жыву. Ён сведка маіх трывог і радасцей, болю і шчасця. Вось чаму я не магу пакінуць Маскву. У гэтым доме часта бываў у мяне сардэчны, ціхі ў размове, у якой быў заўсёды глыбокі сэнс, Янка Купала. Тут з ім і без яго часта гасціла разумная, быстрая на словы і рухі, сардэчная, любімая мной Уладка.

Бываў тут мяккі і мудры Глебка, які быў рэдактарам маёй кнігі «Світанне» і з якім так лёгка, натхнёна мы працавалі над кнігай. Думка ўзнікла ў яго, будзіла ў мяне водгук, і мы хутка знаходзілі патрэбнае слова, якое лоўка клалася ў радкі. Мы з ім шмат гаварылі аб літаратуры. У гэтых сценах гучалі яго словы пра нашых таварышаў Панчанку, Куляшова. Ён чытаў мне іх вершы, чытаў і свае, якія вельмі кранаглі. Верш «Пасылка» ў выкананні аўтара хваляваў да слёз. І сёння чую голас Глебкі, што даходзіў да самага сэрца.

«Смерць салдата» быў апошнім вершам, які чытаў у нас Глебка. Ён так расхваляваўся, што вочы наліліся слязьмі. «А ты ўсё ж нічога, Пятро», — сказаў, усміхаючыся, да сябе. Мы любілі слухаць, як чытаў Глебка — спакойна, удумліва, надзвычай проста і шчыра. Гэта было ў час вайны.

Тады пасля смерці Купалы ў мяне жыла Уладка. Яна вельмі цяжка перажывала гэтую смерць. Дагэтуль я ніколі не бачыла чалавека ўчарнелым ад гора. Уладка была чорная, не толькі твар, але і рукі. Бедная мая Уладка, верны мой таварыш — ад дзяцінства да глыбокай старасці! Шмат разам перажыта, адчута, прагаворана. Потым захапіла яе праца ў музеі Купалы, загадчыцай якога яна стала. Колькі старання, умення, такту трэба было, каб сабраць матэрыялы для экспазіцыі ў музеі. Увесь архіў паэта згарэў у агні вайны ў першыя дні бамбёжкі. Трэба было пачынаць на пустым месцы. Людзі дапамаглі. Ёй дасылалі пісьмы, кнігі, фотаздымкі Купалы. Мастакі стваралі партрэты Купалы, афармлялі музей.

Так напаўняўся экспанатамі пакой за пакоем, якія адлюстроўвалі жыццё паэта, любоў да яго творчасці і яго любоў да народа. Музей ажываў, станавіўся светлай аповесцю пра паэта. У ім адчуваўся жывы Янка. І тыя, хто прыходзіў сюды, не маглі не зразумець, што ўсё тут падабрана вельмі блізкім паэту чалавекам, якому дарагі кожны радок яго кнігі, кожны штрых яго характару, які глыбока разумее веліч паэзіі Купалы і яго значэнне для Беларусі.

Музей Янкі Купалы — вялікі подзвіг Уладкі. Я не забываюся і пра творчую працу ўсяго калектыву музея. Я аддаю даніну вялікай павагі і сардэчнай удзячнасці кожнаму супрацоўніку музея, які стараўся ад душы выконваць задумы Уладкі. Гэты музей мне ўяўляецца родным домам Купалы, дзе вечна будуць жыць паэт і яго верны друг Уладзіслава Францаўна.

***

Мінск я бачыла розным у розны час. Быў ён падобны больш да вялікага мястэчка, чым да малога горада. Гэта да рэвалюцыі.

Памятаю, выклікала мяне паштоўкай княгіня Радзівіл з просьбай наведаць яе ў Мінску. Я вельмі здзівілася такому запрашэнню, але ўсё ж з цікавасцю паехала ў Мінск. Дзе, на якой вуліцы быў тады дом княгіні, цяпер не памятаю. Увайшла я ў пад'езд. Барадаты швейцар у ліўрэі, прачытаўшы паштоўку, паказаў рукой наверх. Я з цікавасцю аглядала шырокую лесвіцу, засланую дыванамі. Нейкая жанчына правяла мяне ў пакой княгіні.

Спаткала мяне сухая старая. У вочы мне кінуліся шаўковыя падушкі паўз сцяну, на якіх ляжалі калматыя рыжыя і чорныя сабачкі. Іх было шмат. Княгіня адвяла маю ўвагу ад іх, запрасіўшы сесці. Сама яна прысела на высокім мяккім крэсле. «Вы — Канстанцыя Буйло?» — ветліва спыталася яна. Я гэта пацвердзіла і падала ёй паштоўку. «Я хачу вам запрапанаваць паступіць у варшаўскі манастыр шарытак. Там вы прабудзеце нейкі час. Калі вырашыце стаць шарыткай, я ўнясу за вас багаты пасаг. Нам трэба мець уплыў на беларускую палітыку. Там вас навучаць усяму, што трэба. Вы можаце там пісаць па-беларуску і дайсці да высокіх годнасцей. Нам гэта вельмі карысна. Я думаю аб беларусах».

Я не спыталася, якую карысць атрымае Беларусь ад таго, што я стану манашкай, і адразу сказала, што не маю ніякага прызвання да манашаскага сану. «Шкада», — суха сказала княгіня і развіталася са мной.

Потым я бачыла Мінск пасля вайны. Разбураны, у кучах друзу, ляжаў ён распластаны на плошчах і вуліцах. Палонныя немцы разбіралі руіны. І мне дзіка было бачыць людаедаў, якія знішчылі горад, забілі столькі людзей, а цяпер пакорліва разбіраюць завалы і больш падобны на простых рабочых, чым на драпежных заваёўнікаў.

Я бачыла, як Мінск узнімаўся з руін. Ачышчаліся вуліцы, адкрываліся плошчы, а дзе-ні-дзе ўжо ўзнімаліся муры аднаўленых дамоў.

Як малады прыгожы волат устаў Мінск пад блакітным небам, раскінуўшы шырокія вуліцы, зялёныя скверы, вялікія плошчы, акружаныя дамамі такой прыгажосці і велічы, якой там ніколі не было. І мне хацелася і смяяцца, і плакаць, гледзячы на красу нашага Мінска.

Ілгуны за мяжой распаўсюджваюць плёткі, што ўрад Беларусі не пускае мяне ў Мінск, не дазваляе там жыць. Гэта няпраўда. Я мела сур'ёзныя прапановы ўрада і Саюза пісьменнікаў БССР пераехаць у Мінск. Чаму я гэта не зрабіла— я расказала вышэй. Мяне, як родная маці, прытуліла Масква. Гэта мая другая Радзіма. Але Беларусь я помню, Беларусь я люблю, Беларусь бачу я вачыма душы — аднаўленую, свабодную, шчаслівую, з яе акрыленым народам, які заваяваў сабе свабоду ў час Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, адстаяў яе з дапамогаю братніх народаў Савецкай дзяржавы.

Такім будзе помнік Францыску Скарыне ў Полацку, які цяпер адліваецца на ленінградскім заводзе «Манументскульптура». Работа скульптараў Андрэя ЗАСПІЦКАГА і Ігара ГЛЕБАВА па праекту Аляксея ГЛЕБАВА.

НА ТРЭЦЯЙ УСЕСАЮЗНАЙ

У самай вялікай выставачнай зале Масквы — Манежы — экспанавалася трэцяя Усесаюзная мастацкая выстаўка «На варце Радзімы».

Каля тысячы твораў жывапісу, скульптуры, графікі, манументальнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і фатаграфіі, прадстаўленых тут, адлюстроўваюць рэвалюцыйныя і баявыя традыцыі савецкага народа і яго Узброеных Сіл. У сотнях твораў пранікнёна раскрыты вобразы абаронцаў Радзімы ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, а таксама ў нашы дні.

Амаль у кожным раздзеле выстаўкі можна было ўбачыць творы беларускіх майстроў. Сярод маляўнічых палотнаў — карціны М. Савіцкага «Поле», П. Свентахоўскага «Трывожная граніца», І. Стасевіча «Радасная сустрэча», М. Меранкова «Граніца». Са скульптурных работ — творы А. Бембеля, З. Азгура, В. Андрушчанкі.

Г. БАКШЭЕВА.

«Я—КРЭПАСЦЬ, ВЯДУ БОЙ»

Усё далей адыходзіць у гісторыю тое суровае чэрвеньскае світанне, калі на Брэсцкую цытадэль абрушыліся першыя залпы вайны. Усё паўнейшым становіцца летапіс подзвігу абаронцаў крэпасці, апетага ў кнігах і фільмах, у палотнах жывапісцаў і вечным граніце мемарыяльнага комплексу.

Але тэма подзвігу бессмяротнага гарнізона далёка не вычарпана. Адно са сведчанняў таго — новы дакументальны фільм «Я — крэпасць, вяду бой», створаны рэжысёрам творчага аб'яднання «Летапіс» І. Пікманам у садружнасці са сцэнарыстам А. Вялюгіным і аператарам Ю. Елхавым.

«Я —крэпасць, вяду бой», — такі сігнал дзень за днём ляцеў у эфір з асаджанай цытадэлі. Галасы яе радыстаў чулі многія. Як сведчыць у фільме генерал - палкоўнік Л. Сандалаў, у тую пару начальнік штаба арміі, гэтыя адрывачныя сігналы паслужылі заклікам да смелага контрнаступлення часцей арміі ад Жабінкі на Брэст. Але вызваліць гераічны гарнізон так і не ўдалося. Вельмі няроўнымі былі сілы...

Як адбывалася бяспрыкладная бітва разрозненых, адрэзаных ад усяго свету жменек храбрацоў з адборнымі гітлераўскімі палкамі? Фільм уражліва расказвае аб гэтым. Акрамя таго, ён адкрывае яшчэ некалькі імёнаў, якія заслужылі сваім подзвігам бессмяротнасць.

Адно з такіх імёнаў — малодшы камандзір Уладзімір Абызаў. Даведацца аб падрабязнасцях подзвігу гэтага воіна кінематаграфістам дапамог выпадак. Здымаючы Брэсцкі мемарыял, яны ўбачылі двух пажылых мужчын, якія журботна схіліліся над ціхай вадой Буга. Адзін з іх аказаўся братам Абызава, а другі — падпалкоўнікам запасу А. Андрэенкавым, што абараняў участак крэпасці пад камандаваннем Уладзіміра. У сорак першым быў ён радавым.

Крок за крокам — па пісьмах, што захоўваліся ў сям'і Абызавых, па ўспамінах людзей, якія ведалі Валодзю, па хатніх рэліквіях — прасачылі кіналетапісцы кароткі, але сапраўды геройскі лёс хлопца з Ногінска, які самой смерцю сваёй здолеў выратаваць для будучых баёў з ворагам сотні таварышаў па зброі. Да апошняй гранаты, да апошняга подыху прыкрываў Валодзя Абызаў іх тайны адыход з асаджанай крэпасці.

А хто тыя бясстрашныя радысты, што ў неймаверна цяжкіх умовах дакладвалі Радзіме пра бой у крэпасці, пра гераічны подзвіг яе абаронцаў?

І гэту тайну прыадкрыў кінагледачам новы фільм. Адзін з радыстаў аказаўся гомельскім хлопцам Гаўрылам Макатровым. Прах гэтага байца быў знойдзены праз 17 гадоў пад руінамі інжынернага корпуса. Тады з газеты «Правда» маці героя даведалася, што сын яе не прапаў без вестак, а загінуў смерцю храбрых у баі.

Аб тым, што гэта значыла для маці, глядач з хваляваннем даведаецца з яе ўласнага расказу аб сыне, які застаўся назаўсёды жывым голасам неўміручай крэпасці.

У новым фільме ажываюць многія імёны, высечаныя на плітах Брэсцкага мемарыяла, ажывае сам іх подзвіг.

ВЫНІКІ ГОДА

На студыі «Беларусьфільм» завяршыўся агляд-конкурс кінастужак, створаных тут у мінулым годзе. На працягу шасці дзён перад работнікамі студыі і іх гасцямі — рабочымі мінскіх прадпрыемстваў, журналістамі, студэнтамі было прадэманстравана 11 мастацкіх і тэлевізійных фільмаў, каля 80 хранікальна - дакументальных і навукова - папулярных стужак трох творчых аб'яднанняў.

На заключнай творчай канферэнцыі агляду - конкурсу лепшай у мастацкім кінематографе была прызнана рэжысура А. Карпава і яго славацкага калегі М. Цяпака ў сумесным савецка - чэхаславацкім фільме «Заўтра будзе позна». Дарэчы, аўтары сцэнарыя гэтага фільма Мілаш Крно і Анатоль Дзялендзік прызнаны лепшымі сцэнарыстамі 1972 года на шостым фестывалі чэшскіх і славацкіх фільмаў, які адбыўся ў горадзе Пльзень.

Сярод дасягненняў аператараў журы агляду-конкурсу адзначыла здымкі Ю. Марухіна ў фільме «Хроніка ночы». Лепшым мантажорам яно назвала Л. Кузьміч, якая працавала над карцінай «Вуліца без канца».

У ліку кінематаграфістаў, удастоеных дыпломаў першага агляду-конкурсу, больш за 20 супрацоўнікаў творчага аб'яднання «Летапіс».

ВАРТАВЫ ВЕЧНАЙ ПРЫГАЖОСЦІ

НЕЗВЫЧАЙНАЯ цішыня сустракае вас у гэтым пакоі. Быццам не вы ўваходзіце ў нахлынуўшае раптам маўчанне, а яно насоўваецца на вас.

Напэўна, вось гэтак жа старадаўнія жыхары Вавілона, спяшаючыся па справах, спыняліся і здзіўлена глядзелі на славутыя вісячыя сады Семіраміды, як вы на палотны, уваскрэсшыя з глыбіні стагоддзяў. Вялікія блакітныя вочы прыкоўваюць увагу, і здаецца, быццам водбліск агню афарбаваў іх так цудоўна і сумна. Пяшчотны вобраз Крысціны Баўэр, створаны ў пачатку мінулага стагоддзя мастаком Смірноўскім, набыў другое жыццё. Заззяла расшытая золатам накідка, адбяліліся карункі раскошнага ўбору, мякка асвяціўся твар. І мастак, які «вылечыў» гэту карціну, стаіць цяпер перад ёй, як саліст на сцэне перад прыціхлай і поўнай глыбокай пашаны залай. Колькі месяцаў затрачана на тое, каб чужы геній, пераадолеўшы перашкоды часу, заззяў, быццам зноў народжаны.

Мікалаю Куйчыку, галоўнаму рэстаўратару Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, давялося быць і цярплівым «тэрапеўтам», і рашучым «хірургам», і нават звяртацца да сродкаў народнай медыцыны. Быццам у цудоўнай машыне часу ён прарабіў шлях, зваротны таму, які зрабіла карціна: ачышчаў адзін слой фарбы за другім. І вось бліснуў асляпляльна яркі мажорны жывапіс таленавітага мастака.

Рэстаўрацыя такая ж старая справа, як і калекцыяніраванне. Але, як і шмат стагоддзяў назад, прафесія гэта — адна з рэдкіх на зямлі. Доўгія месяцы старанна даследуецца шматслойнае нутро незвычайных «пацыентаў». Час, рэзкія ваганні тэмпературы, вільгаць зрабілі сваю справу. Некаторыя карціны знаходзяцца ў стане «клінічнай смерці». А рэстаўратары цярпліва вяртаюць ім жыццё, захоўваючы прыгажосць. І, відаць, не выпадкова мастакоў-рэстаўратараў параўноўваюць з хірургамі. Працуюць яны сканцэнтравана і асцярожна: як і ў аперацыйнай, памылка ў іх справе недапушчальная.

...На мармуровым стале — шалі аптэчных вагаў, скальпелі, маленькія ціскі, тонкія і плоскія іголкі бормашыны. Чалавек у белым халаце асцярожна, быццам павязку з раны, здымае жывапісны слой і пераносіць яго на другое палатно. Цяжкі празаічны прас, замарожаны ў халадзільніку, апускаецца на палатно, і адразу ж па халоднай дарожцы накіроўваецца гарачы прас. Жывапісны слой закансерваваны. Фарбы тонка і роўна ляглі на тканіну, а «гаючыя» настоі і лакі нададуць ім бляск. Усё гэта здаецца вельмі проста. А Мікалай Куйчык месяц аднаўляў усяго толькі пяць сантыметраў рысунка на палатне. Для гэтага неабходны тонкае майстэрства пэндзля, багатыя веды мастацкіх школ мінулых стагоддзяў і шматлікіх сакрэтаў рэстаўратарскага майстэрства.

Для Мікалая Мікалаевіча старая карціна — гэта не толькі гармонія фарбаў на палатне, але і жыццё майстра, самабытнасць яго пэндзля, лёс рысунка. Магчыма таму яго так хвалююць фарбы старажытна-беларускага іканапісу. Праз многія сотні гадоў, вызваленыя ад слядоў пазнейшага запісу, фігурнага гіпсу і пацямнелай аліфы, яны ўражваюць шматколернай навізной. А Мікалай Куйчык жа не кладзе на дошку ніводнага новага мазка, ніводнай лініі. Рухі яго мікраскапічна дакладныя. Знят першы слой запісу — і мы ў XVII стагоддзі, знят другі — у XVI. А скрозь фарбу ўжо прасвечваюць, быццам плынь ракі пад тонкім лёдам, ледзь прыкметныя рысы XV стагоддзя. Першапачатковы жывапіс аголен. І такая закладзена ў ім сіла, што, прабіўшыся праз лабірынт эпох, ён уладарна прыкоўвае нашу ўвагу.

Гэтаму ўменню бачыць цудоўнае ў звычайным Мікалай Куйчык вучыць пачынаючых мастакоў. Тэхніка жывапісу, якую ён выкладае ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце, навука складаная, спасцігнуць яе пад сілу толькі акрыленай і паэтычнай натуры.

Л. КОЗЫРАВА.

Весела пашчоўкваюць каклюшкі. Спрытна перабіраючы іх, дзяўчаты хутка плятуць карункі. Мастацтва паўночных майстроў прыйшло на Аршанскую фабрыку мастацкіх вырабаў ад старой валагодкі Мірапіі Міхайлавай. А галоўны мастак прадпрыемства Святлана Аўраменка стварыла для вязальшчыц дзесяткі ўзораў каўнерыкаў, манішак, сурвэтак. Чатыры гады назад па накіраванні Маскоўскага мастацкага прамысловага вучылішча прыехала яна на фабрыку. Часта бывае Святлана ў вёсках Аршаншчыны. Цікавяць яе тут не толькі вышыўка і карункапляценне. З захапленнем расказвае яна аб майстэрстве Мікалая Сімянкова з вёскі Дуброўка, які робіць на ганчарным станку на дзіва прыгожыя вырабы чорнай керамікі, аб лыжачніках вёскі Марковічы і аб самым умелым з іх — Леанідзе Бераснёве.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Галоўны мастак фабрыкі Святлана АЎРАМЕНКА. 2. Каруначніцы Наталля ГРЫГАРОВІЧ (злева), Валянціна ПІЛЮШКІНА, Людміла ЛАСМАКОВА, Ніна КАНДРАЦЕНКА, Валянціна ЯСКЕВІЧ і Валянціна КУЛІК за работай. 3. Драўляныя конаўкі, зробленыя аршанскімі майстрамі.

Фота Г. УСЛАМАВА.

ПАДКОВА НА ДАРОЗЕ

Заводскі іпадром не прыстасаваны для гледачоў. Ён увесь зарос высокай травой, у якой сям-там праглядаюць белыя галоўкі адуванчыкаў. Толькі бегавая дарожка дбайна дагледжана, падраўнавана. Вось на ёй з'яўляецца цёмнагняды прыгажун, запрэжаны ў двухколавую калясачку — качалку. Рысак з ездаком імгненна праносяцца міма, і праз мінуту недзе на другой палавіне верставога круга ўзнікае казачнае бачанне. Над зялёнымі хвалямі плыве імклівы сілуэт каня, ён вырастае ў памерах, узнімаецца вышэй, тэмп руху шалёна нарастае... І лёгкія воблачкі пылу, што ўспыхнулі за капытамі, чамусьці нагадваюць мне рваны след рэактыўнага самалёта.

Гнядыя, вараныя, шэрыя жарабкі і кабылы змяняюцца на бегавой дарожцы — звычайны рабочы дзень, трэніровачныя заезды. А я не магу адарваць позірка ад гэтых распластаных над зямлёй коней, ад спакойных постацей наезнікаў.

РАДАСЛОЎНУЮ сваю, прызнаную афіцыйна, руская рысістая парода вядзе з 1949 года. Конезавод «Гомельскі» — адзіная ў рэспубліцы гаспадарка, якая спецыялізуецца цяпер на вырошчванні чыстапародных рысакоў. Наогул конны завод быў створаны тут у 1921 годзе, і сваіх гадаванцаў ён пастаўляў Чырвонай Арміі аж да Вялікай Айчыннай вайны. Матачны састаў паспелі эвакуіраваць, але пасля вызвалення Гомельшчыны конезавод пачалі аднаўляць на прынцыпова новай аснове — «нараджалася» руская рысістая парода.

Вырашчаныя тут коні ў двухгадовым узросце трапляюць на іпадромы краіны. І пасля непрацяглых трэніровак, «даводкі», пачынаюць удзельнічаць у заездах. З Масквы і Таліна, Раменскага і Кіева, Харкава і Адэсы прыходзяць у Прудок, цэнтральную сядзібу конезавода, весткі аб перамогах і ўдалых выступленнях гадаванцаў «Гомельскага». Адбегаўшы сваё, коні вяртаюцца ў родныя канюшні. Самых рэзвых пакідаюць тут на племя, іншых прадаюць калгасам і саўгасам краіны для паляпшэння мясцовага пагалоўя.

Высокім у рускіх рысакоў лічыцца клас 2,10; гэта значыць, што конь праходзіць дыстанцыю 1 600 метраў хутчэй за 2 мінуты 10 секунд. Таму імёны Арлякіна (2,07), Пралога (2,06), Такелажа (2,08) і сёння фігуруюць у праграмах рысістых выпрабаванняў. Але бегаюць ужо іх дзеці.

— Прыемная навіна прыйшла сёлета з Раменскага іпадрома, — паведамляе начальнік конегадоўлі Міраслаў Пляго.—Жарэбчык Спурт паказаў рэзвасць 2,07.1. Нашы коні і на міжнародную арэну выходзяць. Штогод мы пастаўляем на аўкцыён у Маскве 10 жарабят паўтарагадовага ўзросту. Яны адпраўляюцца ў Фінляндыю, Італію, ФРГ, Данію, Галандыю. Цана— ад 1 000 да 1 300 рублёў золатам. Наш Трэпет — жарабец-вытворнік на адным з конных заводаў ГДР.

Са шматлікіх расказаў, пра гадаванцаў «Гомельскага» мне здаўся вельмі паказальным вось гэты. Фінскі грамадзянін купіў кабылку ад Тактоўнай. Праз нейкі час яна загінула на спаборніцтвах. Прыехаўшы на чарговы аўкцыён, ён зноў выбраў жарабятка ад Тактоўнай.

Знаёмячыся з гісторыяй конезавода, я звярнула ўвагу на аднолькавасць прозвішчаў дырэктара - заснавальніка і сённяшняга кіраўніка гаспадаркі. Пытаюся ва Уладзіміра Аляксандравіча.

— Так, Аляксандр Іваноў — мой бацька. Ён быў выдатным спецыялістам і, можна сказаць, прысвяціў конегадоўлі ўсё сваё жыццё. Я, скончыўшы інстытут, працаваў на розных адказных пасадах, але аднойчы папрасіўся ў «Гомельскі» працягваць бацькаву справу. Любоў да коней у нашай сям'і — спадчынная. Не мінула яна і сына Аляксандра, ён вучыцца цяпер у Горацкай сельгасакадэміі.

Сям'я Івановых — не выключэнне. Гадоў па 30 працуюць на канюшні сёстры Гулевіч. Наезнік Павел Латугоўскі — пенсіянер, але не кідае работу. У мінулым годзе два яго гадаванцы выйшлі ў клас 2,10. І ветэран атрымаў прэмію за іх выяўленне.

Ілья Аляксееў аддаў конегадоўлі больш за 50 гадоў. Конюх, памочнік наезніка, наезнік... Не раз дэманстраваў сваіх гадаванцаў на ВДНГ у Маскве, атрымліваў медалі і прэміі.

— Але найбольшае хваляванне і радасць, — успамінае Ілья Арсенцьевіч, — дастаўляла мне заўсёды работа з навічкамі. Палахлівае жарабятка, толькі нядаўна ад маткі... Яго трэба ласкай прывучаць да чалавека, не выклікаць ні недаверу, ні злосці. Затым паставіць на правільны ход, выявіць рэзвасць, навучыць разумець і выконваць кожнае патрабаванне наезніка. Памятаю, трапіў да мяне Трамплін. Адчуваю, што магчымасці ў жарэбчыка вялікія, а выявіць іх не ўдаецца. Я да яго і так, і гэтак. І раней усіх бяру ў работу, і ў ляваду пагуляць пушчу. Нічога не атрымліваецца. Прыду дадому — есці не магу, усё мяне мучае такая няўдача. Нарэшце пайшоў Трамплін — роўненька, чыста, ніводнага збою. Я ад радасці не ведаў, на якую нагу стаць. Потым ён на Маскоўскім іпадроме бегаў, 2,09 паказваў.

ГОМЕЛЬ хутка разрастаецца ва ўсе бакі, даўно ўжо цэнтральная сядзіба конезавода апынулася ў яго межах, і сюды можна ездзіць аўтобусам гарадскога маршруту. Збочыўшы з асфальтаванай магістралі, я ішла да трэнінгскіх канюшань па нешырокай грунтавой дарозе і нечакана ўбачыла падкову. Сімвал шчасця... Яно шматграннае і няўлоўнае, і каб яно прыйшло, чалавеку неабходна суладдзе з навакольным светам. Каб вось так, як зараз, шумеў вецер у вершалінах стогадовых ліп, буяла палявое разнатраўе, а недзе побач грацыёзна «ляцелі» танканогія бліскучыя коні і, нібы напамінак аб сабе, часам гублялі на дарогах падковы, як алені рогі ў запаведных лясах.

Жаданне дакрануцца да прыроды, адчуць асалоду ад відовішча імклівага бегу каня, ад спрыту і ўмення наезніка прыводзіць на заводскі іпадром у выхадныя дні сотні жыхароў Гомеля. Таму распрацаваны праект карэннай рэканструкцыі і забудовы цэнтральнай сядзібы конезавода. План разлічаны на 1975—1978 гады. Кошт будаўніцтва — 3 250 тысяч рублёў. Намечана зрабіць іпадром з дзвюма бегавымі дарожкамі (цвёрдай і мяккай) і глядзельнымі трыбунамі на 3 тысячы чалавек, узвесці комплекс трэнаддзяленняў з манежам, аднавіць дзве вялікія запушчаныя сажалкі, добраўпарадкаваць усю тэрыторыю.

Тэрмін маёй камандзіроўкі заканчваўся. З неахвотай ішла я да аўтобуснага прыпынку, раз-пораз азіраючыся на ляваду, дзе бегаў толькі што выпушчаны гняды жарэбчык. Ён насіўся лёгка, вольна, распусціўшы па ветру хвост, нібы рыхтаваўся да ўзлёту.

Валянціна ТРЫГУБОВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: заезд рысакоў. Фота П. БЕЛАВУСА.



ПОМНІКІ БЕЛАРУСКАЙ АРХІТЭКТУРЫ

Не толькі многія гарады Беларусі, але нярэдка і вёскі маюць старажытную гісторыю. Вось і вёска Гарадзец, што на Кобрыншчыне, шмат чаго зведала за восем стагоддзяў свайго жыцця. Ужо сама назва пасялення гаворыць нам аб даўнасці яго паходжання, этымалагічна яна мае два значэнні: гарадзец у сэнсе малы горад і тэрыторыя, «абгароджаная», абнесеная драўлянымі ўмацаваннямі. Менавіта ў апошнім значэнні ўзнік старажытнарускі тэрмін «град»— горад.

Упершыню ў летапісах Гарадзец згадваецца пад 1142 годам. Але адсутнасць самастойнага княжэння, існаванне побач буйных гандлёвых цэнтраў — Брэста, Кобрына, Пінска — не спрыялі развіццю горада.

У XVI стагоддзі Гарадзец налічваў пяць вуліц з 223 пляцамі (сядзібнымі ўчасткамі) і ўваходзіў у склад Кобрынскай эканоміі. У 1589 годзе горад атрымаў магдэбургскае права (права на самакіраванне).

У Гарадцы захаваўся цікавы помнік беларускага драўлянага народнага дойлідства XVIII стагоддзя—Уазнясенская царква. Гэта двухзрубная пабудова, пакрытая агульным дахам (прыём, вельмі распаўсюджаны ў Беларусі ў XVIII стагоддзі). Простае па архітэктуры збудаванне ўражвае строгасцю і манументальнасцю мастацкага вобраза. Дасканалыя прапарцыянальныя суадносіны частак і цэлага, рытмічнасць і маштабнасць, лаканізм выяўленчых сродкаў — усе гэтыя якасці ўвасобіліся ў помніку. Уласна кажучы, амаль што адзіны дэкаратыўны акцэнт—гэта барочная глава складанага профілю з каваным ажурным крыжам, што вянчае сярэдзіну даха пабудовы. У інтэр'еры захоўваюцца каштоўныя творы жывапісу.

Ю. ЯКІМОВІЧ, архітэктар.

НА ЗДЫМКУ: Уазнясенская царква.

ЛЯКАРСТВА ДЛЯ ДРАЎНІНЫ

Упершыню ў сусветнай практыцы стала магчымым захаваць археалагічныя помнікі з дрэва.

У гэтым заслуга вучоных Мінскага тэхналагічнага інстытута імя Кірава. Яны вынайшлі спецыяльны сродак захавання драўніны, якая праляжала ў зямлі многія сотні год. У дрэва ўводзіцца спецыяльнае рэчыва, якое выцясняе з клетак ваду і цвярдзее. Форма і колер вырабу пры гэтым застаюцца без змянення.

Вучоныя распрацавалі таксама экспрэс-метад для кансервацыі невялікіх драўляных прадметаў. Гэтым метадам пры раскопках старажытнага Ноўгарада было выратавана больш за чатырыста прадметаў. Такім жа чынам «закансервавана» 11 пабудоў сялян і брук у горадзе Брэсце.

ФЛОРА ЎСІХ КАНТЫНЕНТАЎ

Мора кветак сустракае ў гэтыя дні наведвальнікаў Цэнтральнага батанічнага саду АН БССР.

На тэрыторыі саду закончана будаўніцтва аранжарэйна-парніковага комплексу. Тут будуць праводзіцца доследы па так званай зімовай выганцы кветак — гладыёлусаў, руж, цюльпанаў, гваздзік. На адным з участкаў, дзе прадстаўлена водная і балотная расліннасць, размешчана новая экспазіцыя травяністых раслін свету. У фондавай аранжарэі абноўлена зялёная «выстаўка» трапічных раслін. У батанічным садзе сканцэнтравана да дзевяці тысяч відаў, сартоў і форм — прадстаўнікоў флоры ўсіх кантынентаў зямнога шара.

ЛАСУНКІ АТРЫМЛІВАЮЦЬ АЦЭНКІ

Члены атэстацыйнай камісіі, якія сабраліся ў асартыментным кабінеце Міністэрства харчовай прамысловасці БССР, былі аднадушныя. Яны ацэньвалі па 30-бальнай сістэме новыя кандытарскія вырабы. Смак, пах, форма, вонкавае афармленне — усё гэта прымалася пад увагу. Сярод рэкамендаваных вырабаў вышэйшай катэгорыі — пернікі «Саюзныя», набор пірожных, якія выпускае мінскі хлебазавод № 3, шакалад «Ванільны» фабрыкі «Камунарка». Дарэчы, на «Камунарцы» з'явілася нямала цікавых і смачных навінак, якія спадабаюцца аматарам салодкага. Гэта — хрусткі шакалад «Пікантны», «Маяк» у карамельнай «сарочцы», «Клубніка лікёрная» і ледзянцовая цукерка «Залацістая».

ГУМАР

Бяздарны акцёр дзяліўся са сваім сябрам:

— Ты ўяўляеш, як я люблю свой тэатр! Нават калі я не іграю, а проста гляджу на сцэну, мяне кідае ў дрыжыкі...

— Ведаеш, і мяне таксама.

— Чаму? — здзівіўся акцёр.

— Ад жаху...

— Чаго ж ты баішся?

— Твайго нечаканага з'яўлення на сцэне.

●

Два тэатралы размаўляюць пра славутага спевака.

— Як ён цудоўна спявае! — кажа адзін.

— Гм... калі б у мяне быў голас, я таксама гэтак спяваў бы.

●

— Ура! Нарэшце я атрымаў вядучую ролю ў п'есе!

— Ты іграеш галоўнага героя?

— Не, але я вяду каня, на якім ён едзе!

●

Сустрэліся двое знаёмых. Размаўляюць. Першы кажа:

— Еду я пазаўчора адзінаццатым нумарам трамвая па Зялёнай вуліцы і раптам бачу: насупраць мяне сядзіць — хто б ты думаў? Паганіні!

Другі памаўчаў, падумаў і кажа:

— Ведаеш што... не хлусі. Адзінаццаты нумар па Зялёнай вуліцы не ходзіць.

●

На канцэрце.

— Ты пазнаеш Бетховена?

— Пачакай, няхай ён павернецца, я тады табе скажу.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-65-84, 33-03-15, 33-65-91, 33-15-15.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі
Зак. № 708.